# ІМЯ ЦЕНЮ — СВЯТЛО

(*гісторыя адной фабіі*)

KAMUNIKAT.org

## Частка першая.

Калі Загадчык гарадской культуры з істэрычным узвіскатам тупой пілы верашчыць, што яна звольнена, так — зволь – не – на за правал учарашняга фэсту, вядома ж, бессэнсоўна нагадваць, што менавіта яна, Вікторыя, папярэджвала, ды што там — проста такі прарочыла на ўвесь голас магчымыя ападкі, заклінаючы правесці "мероприятие" не на вуліцы — усё ж верасень, не ліпень! — а ў сценах палаца культуры, і што ўвогуле яна стамілася, бы тая траянская Касандра, прадказваць няшчасці, якія потым здараюцца з-за чужога глупства ды безадказнасці. Спраўдзілася і ўчора — дакладна так, як маляваў ейны страх: дождж быццам толькі і чакаў узмаху дырыжорскай палачкі, каб абрынуцца скрозь прапалены феерверкамі навес на сцэну і ўмомант — дырыжор не паспеў яшчэ скончыць немузычную фразу з рэзка акцэнтаваным рытмам — ператварыць яе ў свежазалітую коўзанку. Аркестр захлынуўся дажджавой вадою. У пачатку праспекта паказаўся ўжо начальніцкі картэж, а прыбіральшчыцы з вёдрамі ды анучамі, мабілізаваныя Загадчыкам на няроўную барацьбу са стыхіяй, раскірачана соўгаліся па хлюпкай сцэне, павярнуўшыся да высокіх гасцей спінамі. "Кто р-распор-рядился?!" — закрычаў, вылецеўшы з машыны і вылупіўшыся на ўсю гэтую бяссэнсавую валтузню, местачковы Куратар, і Вікторыя, рупліва захоўваючы на твары маску *пераможцы*, адказала на пытанне. Загадчыка, на яго шчасце, побач не было, ён паімчаўся да дырэктара універмага, хацеў заслаць мокрую сцэну дыванамі. "Плевать я хотел на его указания, начинайте концерт!" — прашыпеў, ужо шэптам, Куратар, таму што з аўто

якраз выходзіла пад дагодлівыя парасоны сама Кіраўніца з міністэрства культуры, адно прозвішча якой выклікала ў кар’ерных абарыгенаў трымценне жаху, — цвёрды жэст, якім яна па-мужчынску паціскала працягнутыя рукі, напомніў Вікторыі маму. Менавіта для гэтай сурагатнай маці, а зусім не для дзяцей, і ладзіўся фэст — дзецям наогул давялося горш за ўсіх: вылецеўшы ў іскрыстым рытме “Крыжачка” на коўзкую, як лёд, сцэну, яны адразу ж пачалі падаць... Словам, свята, да якога мастацкія калектывы правінцыяльнага палаца культуры рыхтаваліся ў моцна настоенай атмасферы нервовага зрыву, перанасычанай — аж да немагчымасці дыхаць! — пахам карвалолу, асабліва пасля “наездаў” сталічных рэжысёраў, што ліхаманкава правілі ўжо зацверджаны сцэнар, — свята гэтае абярнулася *задницей*, у якой усе яны цяпер сядзяць. Грубае слова — яго ўчора ўвесь час паўтараў, бы цвікі забіваў ім у галовы, раззлаваны Куратар — назойліва свярбіць ў мазгах, правакуючы — Вікторыя адчувае гэта — прыступ недарэчнага смеху, які пагражае перайсці ў істэрыку. Яна спяшаецца пакінуць кабінет Загадчыка.

На гарадской плошчы яшчэ тлее ўзбуджэнне ўчарашняга фэсту. Рознакаляровыя палаткі прапаноўваюць “у шырокім асартыменце” паўгарэлыя шашлыкі ды “гумавыя” беляшы. Дарослыя і дзеці лянiва працуюць сківіцамі, уталопіўшыся на сцэну (зусім ужо прасохлую), дзе выдурняюцца скамарохі. Натоўп цясніць Вікторыю з усіх бакоў, патыхаючы едкім потам і гарэлачным духам, і яна адчувае, як звычайна ў такіх выпадках, што сэрца надта ўжо часціць. Дзіўна, аднак, іншае: яна не адчувае страху! Недаверліва, без асаблівай надзеі, Вікторыя прыслухоўваецца да сябе: тая дзяўчынка-баязлівіца, што з некаторага часу жыла ў глыбіні яе істоты і зусім не пачувалася

пераможцай, — тая дзяўчынка знікла, быццам памерла. Галаўны боль, які пачаўся ўчора, пасля правалу, па-ранейшаму сцягвае скроні пульсуючым абручом, але страху — страху няма!

Вікторыя задуменна выбіраецца з натоўпу, садзіцца ў бліжнім скверыку на лаўку, дзе трое дзяўчат дымяць цыгаркамі ды разліваюць па пластыкавых пляшках таннае віно. Яна міжволі звяртае ўвагу на вясёлую кампанію, бо ведае адну з іх па мастацкай самадзейнасці. Менавіта з гэтай дзяўчынкі — яна быццам бы адмаўляецца ад чаркі — пасміхаюцца сяброўкі: "А табе — слабо? Давай, пойла выкіпае!" "Не згаджайся," — у думках звяртаецца Вікторыя да дзяўчынкі, што вагаецца, але тая раптам ненатуральна смяецца: "А вось і не слабо!" — і працягвае руку па цыгарку. Вікторыя ўздыхае і паднімаецца з лаўкі.

Да палаца культуры хвілін дзесяць няспешнай хады. Яна спакойна праходзіць праз натоўп, які віруе на ганку універмага, і... раптам спыняецца, уражаная новай і простай, нібыта формула сонечнага святла (сонца — вось цуд! — учора заззяла і дождж перастаў, як толькі Кіраўніца паехала) і такой жа ўсё прасвятляючай думкай.

*Гэта не дзеці на сцэне — гэта я ўчора ўпала.*

Даўні страх спраўдзіўся, збылося горшае з прароцтваў.

А калі так — ёй, Вікторыі, сапраўды няма чаго больш баяцца.

Што ўзломлівае замкі і разрывае ланцугі, трушчыць жалезныя латы рыцараў, бы крохкую шкарлупіну, выпускаючы са змрочных закануркаў падсвядомасці зведаны ў дзяцінстве страх? Вікторыя ведае — што, бо паспытала тое на ўласных сасудах і нервах: *падабенства сітуацый*, няхай нават зусім непадобных з пункту гледжання нармальнага чалавека (але што гэта —

нармальны чалавек? умоўнае дапушчэнне, як адносная атамная маса, не болей). На той падманліва-каварнай ідэнтычнасці ўвесь час рызыкуючы паслізнуцца, якраз як учора дзеці на мокрай сцэне, Вікторыя правальваецца скрозь прагнілыя дошкі гэтага старажытнага *позорища*, якое ведала яшчэ катурны трагікаў ды лапці Пятрушкі, каменем ляціць яна ў глухі калодзеж пад сцэнай, у суфлёрскі буданчык, у сваё — ці ўжо не сваё — дзяцінства, у агульнае дзяцінства ўсіх нялюбых дзяцей, з цемрадзі якога *правальную* гульню акцёраў агучвае страх, паступова ператвараючы памост для відовішчаў у месца катавання.

У дзяцінстве Вікторыя часта траціла прытомнасць, бо была кволай, хваравітай дзяўчынкай. Маці, аматарка папарыцца, па суботах цягала яе з сабой у грамадскую лазню, што месцілася на ўскраіне гарадка побач з дзетдомам. “Вось будзеш дрэнна сябе паводзіць — аддам сюды, дзе дзеці з голымі жыватамі пад плотам валяюцца”, — вядома, маці толькі пужала, але дзяўчынка верыла кожнаму яе слову і ўсё спрабавала зазірнуць праз вялізныя шчыліны ў тым плоце, выглядала ў пабурэлых лісцях ці ў снезе голыя брудныя жываты няшчасных дзяцей, а потым старанна цёрла губкай уласны, які пакрываўся ўжо знізу цёмным пушком, праўда, не такім іржава-драцяным, як у цялістых цётак з тлушчавымі складкамі і адвіслымі грудзямі, што мыліся на суседніх лаўках. Ад пары, грукату балей, мільгацення распараных цел ёй рабілася млосна: запацелы, як шкло, калі на яго падыхаць, пакой некуды сплываў, па руках і нагах пачыналі сноўдаць сотні нябачных мурашоў, а сэрца заходзілася ад жахлівай думкі: што будзе, калі яна, ужо намытая да лялечна-ружовага бляску, зараз упадзе туды, дзе сцякае брудная пена, — у дзетдом! яе аддуць у дзетдом!

*Толькі б не ўпасці, толькі б не…*

Страх рабіў падзенне непазбежным.

Прыходзіла ў сябе яна звычайна на лаўцы прылазніка, у паветры стаяў востры, як лязо, пах нашатыру, а голая распараная маці з па-вядзьмарску ўскудлачанымі валасамі біла яе па шчоках на вачах у такіх жа голых распараных цётак.

Той дзіцячы страх і сорам нечакана ўваскрэслі праз шмат гадоў, калі Вікторыя была ўжо студэнткай, — яны, аказваецца, нікуды і не знікалі, струменіліся сабе паціху ў цёмных цесных куточках цялеснай памяці, без паветра і святла, як брудная вада ў сцёкавых трубах, і вось — знайшлі слабае месца, прарваліся, затапілі нечыстотамі крыштальны палац свядомасці (яшчэ адзін *палац культуры*, у якім Вікторыя быццам бы дырэктар — у тым вось і справа, што *быццам бы*!). Яна баялася страціць прытомнасць у час студэнцкіх першамайскіх дэманстрацый: невядома чаму, спякота і скучанасць узбуджанага натоўпу, гарачкавае трызненне чырвоных сцягоў, бразгатанне аркестравай медзі выклікалі ў яе ўспамін — нават не ўспамін, не, неўсвядомленую клеткавую ўзгадку — пра тую грамадскую лазню, дзе яна *ўпершыню* адчула страх перад падзеннем. Нібыта навакольны свет быў усяго толькі нагрувашчаннем дрэнна прыгнаных адна да адной дэкарацый, за якімі хаваўся *іншы*, убачаны раз і назаўсёды вачамі спалоханага дзіцяці і населены персанажамі яго кашмараў. І як бы ні злавалася Вікторыя на сябе за тое глупства, яна пачала насіць у сумачцы нашатыр і, каб не ляснуцца раптам пад ногі напаўп’янаму натоўпу, старалася прыладзіцца да шэсця з краю. Гэтыя ўхілісцкія паводзіны не маглі застацца незаўважанымі, і камсорг курса абвінавачваў яе ў ідэйнай няўстойлівасці ды індывідуалізме. Не магла ж яна

растлумачыць падцягнутаму, з бездакорным праборам “нітачкай” Лёнечку Валіцкаму, што замест выявы правадыра на чырвоным кумачы ёй мроіцца... нават вымавіць сорамна — распаранае ў лазні голае цела. Тут патыхала ўжо не “ідэйнай няўстойлівасцю”, а вылетам з інстытута. І яна цягнулася на дэманстрацыі, каб адпрэчыць несправядлівыя абвінавачанні, але перш за ўсё даказаць сабе, што яна — дужая і *валодае сабой*, — так, яна была сапраўднай камсамолкай, яна прыкрыквала на сваё цела жорстка і рэзка, а яно ў адказ, нібыта сабатажнік-“белы-каўнерык”, рэагавала галавакружэннем, халодным потам, здрадніцкім болем у сэрцы, а галоўнае — гэтым ганебным, бязглуздым страхам! І ўсё ж з плошчы Леніна, дзе дэманстранты “зліваліся ў адзіным парыве”, яна звычайна баязліва збягала, стараючыся не трапіць на вочы камсамольскім камітэтчыкам. А ўвечары, ад злосці на дурнога дзіцёнка, што сядзеў у ёй, у пакаранне яму, замест парка Горкага, куды скіроўваліся святочна апранутыя сяброўкі, нацягвала кеды і адмахвала, як некалі ў школе, для выхавання волі, сем кругоў вакол стадыёна.

Так, з воляй у яе ўсё было добра, толькі вось, як высветлілася, ёсць рэчы, волі ды розуму непадуладныя — жахлівае адкрыццё таго дня, калі яна ўпершыню адчула страх, уваходзячы ў парка надыханую аўдыторыю, а потым ужо і ў кіназалах прызвычаілася садзіцца з краю, каб раптам, калі што, паспець дабегчы да прыбіральні, змачыць халоднай вадой скроні і лоб — гэта дапамагло, калі Вікторыя, класе ў чацвёртым, “ад’ехала” на ўроку чытання. Настаўніцу, якая штодзень на перапынку бегала дадому праверыць, ці замкнула яна дзверы (на шчасце ці, наадварот, на бяду, небарака жыла побач са школай), у той дзень мучыў асабліва несцярпны сверб неспакою, і яна панеслася правяраць свой

замок, не скончыўшы ўрока, выставіўшы ля дошкі Вікторыю, лепшую ў класе чытальніцу, з кніжкай у руцэ. У страўніку была пякучая пустата, у класе — ані трошачкі свежага паветра (русічка баялася скразнякоў). Апрытомнела на цыратовай кушэтцы медпункта; за прыадчыненымі дзвярыма ўсёй зачырванелай скурай адчула дурасліві галас аднакласнікаў, іх здзеклівае пакепванне. Урэшце, самыя нахабныя, з драпежна-цікаўнымі тварамі, сачылі за ёю, стоячы тут, ля кушэткі — у медсястры не хапіла розуму выставіць іх прэч.

Аказваецца, нічога не сціраецца з памяці, думала Вікторыя, усё запісваецца на стужку, якая раптам, праз гады, пачынае пракручвацца зноў, мярцвяк уваскрасае і ўказвае сухім касцяным “перстом”, як жыць жывым. Вядома ж, сцібаючы пад бадзёрым транспарантам, яна разумела, што цяперашні яе страх такі ж абсурдны, як бязглуздая педантычнасць вучыцелькі, чые дзверы непазбежна аказваліся замкнёнымі; што напоены вясною Мінск — не гарадская лазня; што ўпэўненая ў сабе студэнтка, камсамолка і г.д. не мае нічога агульнага з галоднай зашуганай дзяўчынкай у перакручаных, абы як зацыраваных “хэбэшных” калготках, у школьнай форме, што куплялася навырост і таму мела на локцях ромбы-латкі, выкраеныя з колішняй форменнай сукенкі, якія адрозніваліся па колеры, — з той дзяўчынкай, якой яна калісьці была. Але насуперак яснаму *разуменню* гэтых бясспрэчных фактаў нехта ў ёй, відавочна, пераблытаў адзін пласт часу з іншым, і ў выніку эфекту накладання ўтварылася трэцяя, даволі-такі ідыёцкая карцінка.

...Яна ўзненавідзела мітынгуючыя плошчы, вялікія скрыжаванні, дзе счэпліваюцца драпежна-цікаўныя пагляды, скрозь строй якіх цягнулася, напружваючы спіну, як рэкрут пад

ударамі шпіцрутэнаў; не цярпела адкрытай прасторы і спяшалася хутчэй зліцца з шэра-бетонным пейзажам; навучылася ўзводзіць будаўнічыя рыштаванні з лжывых адгаворак і апраўданняў, якія, як ёй здавалася, толькі і ўтрымлівалі ад *падзення* гатовую абрынуцца Пізанскую вежу яе рэпутацыі. Не, яна не магла дазволіць нейкай слабасці зламаць тыя бліскучыя перспектывы, якія адкрываў перад ёю чырвоны дыплом! А між тым дайшло ўжо да таго, што нават у ліфце ўзнімацца на дзесяты паверх роднай “абшчагі” ёй трэба было адной (потныя целы, што набіваліся ўшчыльную, выклікалі сутаргу нудлівых дрыжыкаў), і Вікторыя, дачакаўшыся ліфта, рабіла выгляд, што звыш меры засяроджана на падручніку (які меўся тут жа, напагатове), і наўмысна націскала на кнопку паверха, нягледзячы на папераджальныя воклічы падбягаючых. Але аднойчы яе злавілі, застукалі на гарачым. “Ты вельмі любіш адзіноту, праўда?” — дзверы ліфта, якія ўжо зачыняліся, па-здрадніцку раз’ехаліся і самкнуліся зноў, і яна апынулася ў цеснай прасторы кабіны сам-насам са светлавалосым, спартовага выгляду юнаком, які разглядваў яе даволі бесцырымонна пукатымі шэра-блакітнымі вачамі. І, невядома чаму ўявіўшы, што ён **здагадаўся,** Вікторыя з перапуду нагаварыла незнаёмцу пра сябе першае, што прыйшло ў галаву — *аб алергіі на пахі іншых людзей,* так-так, незвычайны выпадак, урачы разводзяць рукамі... Слухаў уважліва, не перапыняў, гэта яе адразу насцярожыла, хто ж ведаў, што ён — студэнт медінстытута! Калі б яна тое ведала, далібог, прыдумала б што-небудзь цікавейшае, бо ўсе пяць год, што яны пражылі разам з Сярожам, вымушана была падтрымліваць першапачатковую легенду, імітуючы неверагодную адчувальнасць да пахаў, якой у

яе, зразумела ж, ніколі не было, і ўтойваць сапраўднае становішча.

Хлусня і страх — звяркі адной пароды: запанаваўшы ўнутры нас, яны выцясняюць наша сапраўднае "я" у глухую каморку без вокнаў, дзе яно пакутуе, бы прывід Кацярыны пад уладаю ведзьмака, а самі захопліваюць лепшыя пакоі гаспадароў дома.

Галаўны боль, ад якога свярбіць скура на цемі, а скроні сціскае нібыта металічны абруч, проста нясцерпны. Калі зараз прыняць таблетку — абруч хутка распадзецца на дзве палавінкі, яны чорнымі вужакамі спаўзуць некуды ў цемру пад крэслам. Вікторыя адкрывае сумачку: ну трэба ж — такая абачлівая, сёння яна не захапіла з сабою нават валідола! На дне сумкі самотна ляжыць адно непачаты чырвона-жоўты пачак. Той самы, які — яшчэ ўчора яна так думала — дапаможа ёй пакінуць абрыдлы тэатр жыцця, выйсці *праз дзверы, якія заўсёды адкрытыя…* Што змянілася з учарашняга ранку? Страх. Няўжо ён знік — сам? Вікторыя адкладвае ўбок сумку. Не, не цяпер… Эксперымент, у які яна ператварыла ўласнае жыццё, і без таго, здаецца, блізкі да заканчэння. Ці вернецца страх? Ах, як хочацца верыць, што — не! Аднак, БМС (былы муж Сярожа — так яна "скараціла" яго, аматара абрэвіятур накшталт МДП, ННС[1], тых цукерачных фанцікаў, у якія так зручна загортваць цэлы свет, не падобны на твой уласны) казаў, што лячыць фабію — гэта ўсё роўна што стрыгчы крону дрэва: замест старых галін адразу ж пачынаюць расці новыя, пакуль не выцягнеш, як той нерв пасля выдалення зуба, **корань страху.**

*Ці выцягнула я гэты корань?*

[1] МДП — маніякальна-дэпрэсіўны псіхоз, ННС — неўроз навязлівых станаў.

Адкінуўшыся на спінку крэсла, Вікторыя аглядае кабінет (ужо не свой), заплюшчвае вочы, масіруе пальцамі павекі, як вучыў яе БМС, але павекі па-ранейшаму налітыя болем, і застылыя нявыплаканыя слёзы — не слёзы, а шматгадовыя саляныя адклады з бачнымі на іх паверхні адбіткамі вобразаў рэчаіснасці, што ў розны час штурмавалі сятчатку, — тыя аскепкі мінулага засцяць ёй зрок, перашкаджаюць бачыць *тут і цяпер* у яго маментальнай непаўторнасці. Дагэтуль яна бачыла свет скрозь нявыплаканыя слёзы — можа, таму ён здаваўся ёй такім *страшным*?

Ён думаў, што поўнасцю пазбавіў яе ад праблем тады, калі быў яшчэ студэнтам, які вагаўся паміж псіхіятрыяй і хірургіяй, і яе рэдкая форма “псіхагеннай алергіі”, як ён глыбакадумна вымавіў, калі ліфт спыніўся на апошнім паверсе, — тая выдуманая ёю хвароба, пэўна, і вызначыла ягоны выбар. Сяргей зацікавіўся ўсур’ёз, выпытваў усё новыя падрабязнасці, а яна, не жадаючы расчароўваць яго, усцешаная ўвагай, выдумляла ўсю тую лухту, адчуваючы сябе нібыта на подыуме, у захопліваючым дух экзатычным строі з паўлінавага пер’я, усмешка, фотаўспышка, дзякуй, міс! — сама пачынаючы верыць у сваю хлусню, яна натхнёна і западрабязна распісвала тыя быццам бы незвычайныя адчуванні, а ён — ён схапіўся за шанц вылечыць яе з самаўпэўненасцю студэнта-трэццякурсніка. Тады толькі пачалі з’яўляцца перакладныя публікацыі пра “работу з сімптомам”, пра вызначальны ўплыў псіхікі на фізічныя працэсы, і ён купамі цягаў ад “прасунутых” калег літаратуру, выпрабоўваў на ёй методыкі Віктара Франкла, Эрыка Берна, Луізы Хей: нібыта прынц абуджаную пацалункам прынцэсу, ён вызваляў яе з зачараванага

замка, дзе час спыніўся шмат гадоў таму, а постаці караля і каралевы замерлі ў класічных паставах жаху згодна нейкаму старажытнаму, патрапанаму на згібах *сцэнару* з перадвызначаным трагічным канцом; ён прадзіраўся разам з ёю скрозь непралазныя пушчы *парадаксальнай інтэнцыі*, дзе дрэвы-вар'яты растуць каранямі ўверх і на гэтых пераблытаных, нібыта клубок яе страхаў, каранях спяваюць перасмешнікі; прымушаў яе па некалькі гадзін у дзень прысвячаць “рабоце з люстэркам”. Я люблю цябе, я люблю цябе,

тупа паўтарала яна свайму адлюстраванню, — ён, стоячы побач, неяк перахапіў яе пагляд-адбітак, і пасля гэтага ўсё паміж імі пайшло ўжо не па кніжках.

Вядома, яна пакахала яго ад самага пачатку: пакахала свой адбітак не ў раўнадушным шкле, як таго патрабавала спадарыня Хей, а ў Сярожавых ўважлівых вачах, як, увогуле, толькі і ўмела *любіць сябе*, і тут нічога зрабіць было ўжо немагчыма. Як ёй хацелася, каб яе любілі! Таму і захоўвала сваю ганебную таямніцу, бо баялася, што ён прасякнецца агідай да яе сапраўднай, непрыдуманай хваробы — у тым, што гэта менавіта хвароба, яна анікольκі не сумнявалася і, як толькі ён сыходзіў, накідвалася, бы згаладнелы на хлеб, на пакінутыя ім кнігі, і чытала тых Юнга і Адлера, Франкла і Фрома, аж пакуль ёй не пачынала мроіцца, што яна сама — хадзячы падручнік па псіхіятрыі.

Прыкладам, Вікторыя прачытала, што фабіі, то бо навязлівыя страхі, характэрныя для розуму, звязанага з мастацтвам, з-за асаблівых схільнасцей такога розуму да звышпачуццёвага досведу. Зрэшты, яе мала ўсцешвала вытанчанасць кампаніі, у якой яна, дзякуючы тыпу свайго розуму, апынулася: Эдгар По, Гогаль, Гёльдэрлін, Кафка... Муж цярпець не мог усіх гэтых

“неўротыкаў і псіхапатаў”. “Кафку трэба было лячыць у прымусовым парадку”, — самаўпэўнена зазначаў, пагладжваючы брытвай шырокае падбароддзе. “Але тады не было б “Ператварэння”, — пярэчыла яна, бо ў героях Кафкі са змешаным пачуццём жаху і задавальнення ад нарэшце такі знойдзенай *суполкі* (сукамернікі, няйнакш) пазнавала сябе. “Затое быў бы шчаслівы чыноўнік страхавой фірмы”, — адразаў ён. Асцярожна, каб не выклікаць падазрэнняў, дапытвалася, што б ён параіў “адной сяброўцы”, якая — “вось дзівачка!” — баіцца страціць прытомнасць у грамадскім месцы; ён нязменна рэкамендаваў “сяброўцы” адмовіцца ад трагічнага светаўспрымання, якое ляжыць у аснове ўсіх неўрозаў, і, вядома ж, меў рацыю. Быў час, калі Вікторыя зайздросціла тым, у каго ад нараджэння нервы — сталёвыя тросы і сэрца — “палымяны матор”. Гэта ўжо потым, потым, перад канчатковым разрывам з БМС, што супаў з яго захапленнем моднай заходняй навінкай — НЛП, то бо нейралінгвістычным праграмаваннем, яна не захацела ўступіць яму сваё асабістае права *быць няшчаснай*, і на яго ўзбуджаны віскат: “Чалавек — гэта біякамп’ютэр! Энэлпі зробіць усіх абсалютна шчаслівымі!” холадна пацiскала плячыма: “Усеагульнае шчасце — улюбёная мара псіхапата”.

Не, не хацела б яна жыць сярод людзей, чый ранак пачынаецца з *афірмацый* тыпу *“я люблю свае геніталіі”*, а ўночы астылыя адзін да аднаго муж і жонка дружненька выконваюць практыкаванне *“рэанімацыя рамантычнага кахання”*. І яшчэ: яна цярпець не магла ўсіх гэтых жучкаватых, нахабных “фрэйдаў” сваёй гадоўлі, што з партыйнай эмпатыяй падаграюць на ленінскім агеньчыку пераляжалыя заходнія стравы, прыпраўляючы іх соусам уласных неадрэагаваных неўрозаў. Што

да БМС, дык ён даволі такі паспяхова прыстасаваўся *рабіць з лімона ліманад,* а выціснутую скурку збываць па цане першагатунковых фруктаў. “Вылечыўшы” уласную жонку ад складанейшай формы “псіхагеннай алергіі”, ён настолькі паверыў у сваю геніяльнасць, што звольніўся з райпсіхдыспансера і адкрыў прыватную практыку: *псіхакарэкцыя, кадзіраванне, пазбаўцеся ад залішняе вагі, забудзьце пра дэпрэсію, адчуйце асалоду жыцця* — (“Селядзец “Матросік” — шчасце ёсць!” — падказвала Вікторыя пачутае з тэлеэкрана, чым прыводзіла яго ў шаленства). “Асалода” ды “шчасце” — гэта былі словы-фетышы, якімі ён жангліраваў перад абдуранымі суграмадзянкамі (бо менавіта жаночы элемент валам паваліў на ягоныя “сеансы”), як той доктар, што глянцавіта пасміхаецца (над намі ж, дурніцамі, і пасміхаецца!) у рэкламе зубной пасты альбо пракладак. Не хацела б яна жыць у свеце рэклам, якія прымушаюць чалавека стаць дасканалым — *ідэальнае цела ў ідэальным аўтамабілі!*— і тым робяць з яго неўротыка не менш паспяхова, чым партыйныя “чысткі”.

Нeяк Вікторыя пабачыла, як у напаўцёмным пакоі адны “ад’еханыя” цёткі, распасцёршы рукі, у малітоўным экстазе стаяць “пад даляравым дажджом” (зразумела, уяўным), а другія, раскінуўшыся на канапе, чакаюць, пакуль “пан доктар” падыдзе па чарзе да кожнай і з пагрозлівым вокрыкам “Тлушч, сыходзь!” памацае яе праз адзенне за тлушчавыя складкі (Вікторыі адразу чамусьці ўзгадвалася лазнева-пральнае яе дзяцінства). Божачкі, думала яна, гэта ж да чаго трэба бабе дайсці: плаціць неблагія грошы за тое, каб яе чужы мужык памацаў! Дарэчы, потым ён забараніў ёй прыходзіць на “сеансы”, бо яна, маўляў, сваім скепсісам разбурае ауру веры, якую павінны мець пацыенты, каб “афірмацыі” спрацавалі. Ён даўно закінуў тыя разумныя кнігі, па

якіх калісьці займаўся з ёю, — Франкла і Фрома замяніў свет рэкламных ролікаў. Не ў стане ўжо трываць, яна пісала фламастэрам і ўкладала ў папку для яго дзелавых (нібыта!) паперак "Рэкамендацыі ДБМ" (душэўна браніраваным мудакам — яшчэ адна прыдуманая ёю абрэвіятура):

*пазбаўляйцеся ад вашага індывідуальнага "я", а таксама — ад перхаці, непрыемнага паху з роту, жуйце гумку "Орбіт" ды псіхалагічную жуйку, якую выплюнулі ўжо заходнія ДБМ.*

А як высветлілася потым — адной са шматлікіх яго пацыентак гэтыя рэкамендацыі прынеслі такі карысць, і не абы-якую. З'яўўшыся на яго "сеансах" з нейкімі хімернымі скаргамі, яна глядзела на "пана доктара" з захапленнем, шырока расхінаючы веі ў *Max Factor*'аўскай тушы (*касметыка для прафесіяналаў!*), як на наваяўленага беларускага Фрэдэрыка Перлза, а яму, як высветлілася, толькі тое і патрэбна было: ён таксама любіў не сябе, а свой адбітак у нечыіх закаханых вачах. Не выключана, што і ажаніўся ён з Вікторыяй для таго толькі, каб пастаянна глядзецца ў люстэрка свайго "ашаламляльнага поспеху". Яна, Вікторыя, была яго талісманам, яго Перамогай, але аднойчы талісман узяў дый трэснуў. І ніякая "рэанімацыя рамантычнага кахання" — *з дзесяці пунктаў, паўтараць перад сном, дыханне рытмічнае* — не ў стане ўжо была дапамагчы.

Не, мала таго, што галаўны боль узмацніўся, дык цяпер яшчэ перад вачыма замільгацелі нейкія чорныя плямы, бы мошкі летнім днём мак таўкуць. Ды якія там мошкі — ужо чорны снег паваліў проста ў кабінеце, куды б яна ні перавяла пацяжэлыя зрэнкі: на стол, сцены з дыпломамі ў рамачках, што заваяваў палац культуры за гады яе дырэктарства... І ўсё гэта — і дыпломы, і

званні, і рамонт даху, які выцягнула з дапамогай добрых людзей, ні капейкі не ўзяўшы з гарадскога бюджэту, і новая шыкоўная заслона на вялікай сцэне — усё-усё змыў учарашні дождж, злізнуў у калодзеж ліўнёўкі, бы каляровае смецце адгудзелага свята...

Але... ўчора яна не адчувала страху! Калі Кіраўніца злосна кінула: “Спыніце канцэрт!”, калі Куратар удваіх з Загадчыкам кінуліся выконваць загад, з заўзятасцю нацкаваных аўчарак уварваліся ў танец, пачалі хапаць дзяцей за рукі і сцягваць са сцэны (быццам бы розум ад страху страцілі бугаі, а было ж прасцей і больш па-чалавечы, ці што, даць знак аркестру змоўкнуць, падысці да мікрафона, падзякаваць і адпусціць танцораў), — дзяўчаткі ў нацыянальных касцюмах, нібыта раптоўна пабуджаныя, не маглі зразумець, чаго ад іх хочуць узмакрэлыя ад старання дзядзькі з вылупленымі вачыма, — і толькі яна, Вікторыя, што заўсёды тушавалася перад начальствам, на гэты раз не разгубілася, не абмерла ад страху, які спаралюшаваў усіх: і аркестр, што працягваў іграць, нібы заведзены, і рэжысёра, і вядучага — яна знайшла ў сабе сілы абняць дзяцей за плечы, прашаптаць словы суцяшэння і падтрымкі. І, не зрабі яна гэта ў той момант, хто ведае, чым абярнулася б для маленькай “зорачкі” Настачкі, якая танцуе ўжо на міжнародных конкурсах, нервовага, кволага анёльчыка, учарашняе падзенне? Беспрычынным (а то ж! знайдзі яе потым, прычыну!) страхам, які раптам, гадоў праз дваццаць, пачаў бы мучыць вядомую артыстку пры выхадзе на сцэну, і не было б на тое ніякай рады, а ў выніку — разбітая сям’я, зламаная кар’ера, а то і, крый Божа, такі вось пачак з транквілізатарамі — *прыняць увесь цалкалкам, лепшая зброя супраць болю!—*

які ляжыць зараз у яе, Вікторыі, сумачцы, як апошні аргумент у шматгадовай барацьбе з фабіяй.

Страх прыводзіць за сабой хлусню. А калі няма шчырасці, каханне памірае. Яе шлюб пачаў гінуць з той, самай першай хвіліны, калі яна ў кабіне ліфта схлусіла Сярожу. І апошняе, танютка-перарывістае, кволае дыханне яе кахання, бы бетоннай плітой ва ўзарваным тэрарыстамі будынку, прыдушыла ўсё той жа хлуснёй.

Перадусім Загадчык скіраваў яе ў камандзіроўку ў Мінск. Перапоўненая электрычка, "асцярожна — дзверы — зачыняюцца" і раптам — успышка ў мозгу, якая высвеціла за наўмысна-дэкаратыўным фасадам таго снежаньскага ранку іншы, сонечны і спякотны: зялёнае ад недасыпу дзяўчо вяртаецца ў смуродлівай электрычцы дадому пасля экзаменаў у інстытут (здадзеных, дарэчы, на пяцёркі), страўнік зводзіць сутаргаю голаду, калі б не потныя целы, прыціснутыя да яе з усіх бакоў, яна ўпала б проста на падлогу. "Жанчына, тут свабодна?" — пытаецца бабулька ў футры і пуховай хустцы. "Дяўчынка, табе ўжо лепш?" — пытаецца дзядзька ў тэнісцы, ён чамусьці трымае яе на руках — *я ўпала? няўжо ўпала?!* — свядомасць вяртаецца, мятны пах карвалолу, голас машыніста ў дынаміку — медыка просяць прайсці ў адпаведны вагон, да яе не адразу даходзіць, што гэта яна — віноўніца перапалоху. "Жанчына, я трэці раз у вас пытаюся, ці свабодна тут?" — нарэшце, яна чуе і — які жах! — бачыць, што чыноўнік з гарадской адміністрацыі, які сядзіць насупраць, пачынае ўжо са здзіўленнем на яе пазіраць. І тут жа, як па сігналу "трывога!", сэрца заходзіцца барабанным боем, кроў, што струменіцца ў сасудах, гатова выйсці з берагоў, рушацца

наведзеныя масты, ядры б’юць па сваіх жа, разведчыкі перабягаюць на бок ворага...

*Толькі б не ўпасці, толькі б не…*

Вікторыя праціснулася ў тамбур: усюды — людзі-людзі-людзі, драпежна-цікаўныя погляды. Супакоілася толькі, калі знайшла прыбіральню і зачынілася там — уф, нарэшце, адна! — і нават, разглядаючы свой спалатнелы твар у люстэрку пудраніцы, паспрабавала пажартаваць над сабой (хоць якія там жарты): калі ў яе і сапраўды — *алергія на пахі іншых людзей*, дык чаму ж смурод урыны раздражняе яе зараз менш, чым даволі прыстойны пах вагоннага натоўпу?

На наступнай станцыі яна выйшла.

У той вечар, збянтэжаная — яна ж думала, што страх пакінуў яе назаўсёды! — сказала мужу, што прыступ “алергіі” паўтарыўся. Ён прамаўчаў, не адводзячы вачэй ад тэлевізара, вось тады дык яна і ўцяміла, што паміж імі — усё скончана, што яна не кахае яго больш. І класічны шлюб доктара і выратаванай пацыенткі, увекавечаны ў літаратурах свету, на “тутэйшым” узроўні не атрымаўся — хіба што пародыя, не болей. Пяць год таму страх нікуды не дзеўся, ён проста адступіў са змяіным шыпеннем, звіваючыся кольцамі, перад адзінай у свеце сілай, супраць якой нічога не можа зрабіць: перад каханнем. Любоўнае зелле, якім апаіў яе прынц ля зачараванага замка, перастала дзейнічаць, і страх вярнуўся. І тое, што Сяргей разлюбіў яе, таксама праўда: вось ён маўчыць і думае зараз не пра яе, а пра тое, што пацярпеў фіяска, што ніякі ён не беларускі Фрэдэрык Перлз, а правінцыяльны шарлатан, які дурыць пакутуючых на атлусценне забяспечаных дамачак ды іншых фрустрыраваных ідыётак, аб чым ён, між іншым, і сам даўно здагадваўся. Ён таксама насіў у

сабе свой страх *прыніжэння,* і ратаваўся, як мог — улюбёнымі вачыма той жанчыны, якая, пэўна, была ідэальным спажыўцом рэклам і "карысных парад" у часопісах — *ты крутая і класна выглядаеш! а цяпер — дзесяць спосабаў спаймаць яго на кручок!* — так, тая кабета вучылася жыць па глянцавых дамскіх часопісах, а не па кнізе "Як гартавалася сталь". Што ж, яна правільна ўсё разлічыла, дакладней — "праінтуічыла" нутраным, жывёльным чуццём самкі, якое такім ад нараджэння даецца замест розуму: Вікторыі ў той момант было не да "рэанімацыі рамантычнага кахання", бо яна стамілася ад пастаяннага напружання шматгадовай хлусні, ад бясконцых войн, якія вялі паміж сабой два яе "я".

У ёй ужываліся (дакладней, ніяк не маглі ўжыцца) дзве розныя асобы; адну з іх, Упэўненую Пані, *пераможцу* з аптымістычна-дзелавітай манерай паводзінаў, Вікторыя скіроўвала ў свет у якасці пасла сваёй унутранай дзяржавы. Паслу і паўпрэду даводзілася пад афіцыйнай усмешкай дыпламата хаваць дурныя звесткі: на радзіме — мор, чума, грамадзянская вайна, а тут, на бліскучым паркеце свецкіх прыёмаў, у атачэнні шпіёнаў ды тайных нядобразычліўцаў, трэба як мага натуральней пасміхацца, як мага мацней паціскаць працягнутыя рукі, паўтараючы: *"Very glad to see you"*. [2]

Упэўненая Пані кіравала палацам культуры, добра пастаўленым голасам вяла перамовы са спонсарамі, улагоджвала начальства: а то ж — Вікторыя! Імя ёй выбіраў дзядуля-ардэнаносец: "Мая ўнучка мусіць быць вартай нашай Вялікай Перамогі!" І яна рупілася з усіх сіл "быць вартай" — спачатку

[2] Вельмі рада вас бачыць (англ.).

піянеркай, потым камсамолкай, і, нарэшце, “маяком мясцовай культуры” — крылатая багіня Перамогі, якая раптам, бы тая старажытная Ніка, *губляла галаву*, і, як п’яны рыбак у палонку, правальвалася ў сваё дзяцінства. І тады месца Упэўненай Пані займала дзяўчынка-падлетак — тая дзяўчынка, што дваццаць год таму ў паніцы чакала прыходу маці з працы: ад страху ў яе балеў жывот, яе ванітавала, ногі падкошваліся; як толькі стрэлка гадзінніка набліжалася да шасці, яна пачынала, бы падстрэленая, мітусіцца па кватэры, спрабуючы прадбачыць, што на гэты раз стане пускавым механізмам скандалу: дрэнна выкручаная ануча для посуду? пясок ад абутку на падлозе? — яна спяшалася патушыць іскры магчымага пажару — паслухмяная дзяўчынка, выдатніца, член савета піянерскай дружыны — але маці заўсёды, заўсёды знаходзіла прычыну: дрэнна накрухмалены каўнерык школьнай формы, беспарадак у пісьмовым стале... “Нікчэмнасць! Дрэнь!”— істэрычна крычала маці, шпурляючы ёй у твар выдраны з “мясам” каўнерык, выварочваючы на падлогу скрыні пісьмовага стала. У маці быў гучны, добра пастаўлены голас, звыклы да выступленняў з трыбуны, і калі назаўтра па дарозе ў школу суседка з’едліва цікавілася, хто ў іх так віскоча штовечар, Вікторыя, запунсавеўшы, адказвала: “Тэлевізар...”

Вось у гэтую зацкаваную, сцятую дзяўчынку, з потнымі далонямі, у падлетка, які саромеецца свайго цела, яна ператваралася, шпарка губляючы на зваротнай дарозе свой дарослы вопыт і багаж “адносін”, варта было БМС абняць яе ў цёплым святле начніка. У час “кантакта” (яго слоўка: не каханне, не секс, а — кантакт, бы з іншапланецянамі, ці вось яшчэ — “абмен вадкасцямі ў працэсе тактыльных адчуванняў”, для яго, прыдурка разумнага, быў чамусьці важны менавіта гэты “абмен”,

ужываць прэзерватывы ён наадрэз адмовіўся, а дзяцей не хацеў, бо дзеці, бач ты, перашкода “свабоднаму развіццю асобы”, і яна, добрая, паслухмяная жонка, збегала два разы на аборт, пасля чаго, пэўна, назаўсёды страціла магчымасць зацяжараць), побач з ім яна пачувалася абсалютна бясполым кавалкам гліны, і цяжка сказаць, што было прычынай: яго дурныя псеўдамедыцынскія клішэ ці яе не менш дурное “усё мусіць быць прыстойна” — маміна спадчына, замест падушак з гусіным пухам ды вышытых крыжыкам рушнікоў атрыманы пасаг. Усё “непрыстойнае” трэба было хаваць, як утаіла яна ад мужа сваю фабію, як утаіла ад маці свае першыя месячныя, таму што паняцця не мела, што гэта з ёю адбылося; сказаць пра тую ганьбу маці было немагчыма, — тая, убачыўшы аднойчы ў акно, як Вікторыю возіць на раме веліка хлопчык з першага пад’езда, кінула ёй дома ў твар пагардлівае “курва!” — і яна панесла свой сорам і жах ува двор, дзе нарвала трыпутніку, бо ведала: трыпутнік ужываецца, каб спыніць кроў, — і дома напхала лісця сабе ў трусы, а калі ўсё выявілася, забілася ў вугал паміж крэслам і падаконнем, дзе заўсёды хавалася, але маці на гэты раз не абазвала яе ні “курвай”, ні “дрэнню”, а суха патлумачыла, што “гэтая гідота” будзе адбывацца з ёю кожны месяц. “Чаму ты такая зацятая? Ты, пэўна, фрыгідная”, — гаварыў БМС, адваліўшыся ад яе і цяжка дыхаючы, а яна проста баялася штосьці зрабіць не так, яна пачынала кантраляваць сябе, думаючы толькі пра тое, ці дастаткова яна сексуальная (“ці добра накрухмалены каўнерык?”) і, вядома, тут і гутаркі не магло ісці пра яе аргазм.

І аднойчы яна пагрозлівым вокрыкам загнала тую дзяўчынку ў яе схованку, і ўпусціла ў шлюбны ложак замест сябе Упэўненую Пані з узбуджальным водарам мускусу, у экстра-класным

чырвоным бюстгальтары і такіх жа стрынгах, — БМС, прасцяк, быў падмануты гэтымі піратэхнічнымі эфектамі, феерверкам штучнай жарсці, ён здрадзіў ёй, сваёй Вікторыі, з гэтай лжэ-Вікторыяй! Яна імітавала "бурны аргазм" (**табе**, даражэнькі, трэба? на, атрымай!), шчабятала "мілыя глупствы", і ён, дурненькі, пыхцеў ад асалоды: "Ты сёння проста цудоўная!" А ёй крычаць хацелася, бо ўхваленні тыя прызначаліся не ёй, не ёй! Ці магла яна расчараваць, агаломшыць яго, яшчэ цёпленькага, разамлелага пасля "кантакту", сваімі ранамі дзяцінства — *"о, поле, хто цябе засеяў мёртвымі косткамі?"* — сваім унутраным полем бітвы, дзе крыкі груганоў ды стогны паміраючых? І ёй заставалася іграць да канца сваю прыкрую ролю, але на гэта моцы ўсё часцей не хапала, яна не вытрымлівала, як доктар Джэкіл, твар якога скрывіла сутарга Хайда, — *я быццам бы нацягнутая струна!* — бо ўсё цяжэй станавілася заглушаць у сабе гукі пякельнай бойкі, той міжусобіцы, якую бесперапынна вялі два яе "я". "Ніяк не магу зразумець, — здзіўляўся БМС, гладзячы яе пругкі, бы шкарлупіна зялёнага арэха, жывот, — гімнастыкай не займаешся, а які прэс накачаны!" — а ў яе нават у ложку (у ложку — асабліва!) усе мышцы былі напружана-сцятыя. Ці доўга можна было вытрымаць такое?

Пасля яго сыходу ёй засталося ўбогае суцяшэнне, бездапаможны смяшок: які ж ты Фрэйд, мой дарагі, калі клаўся ў ложак з жанчынай і не зразумеў, што яна не тая, за каго сябе выдае. Яна вярнула яму "прасунутыя" кнігі і раздрукоўкі афірмацый, якія могуць вылечыць усё — ад няшчаснага кахання да гемароя, у думках пагрузіла іх назад у той ліфт студэнцкай "абшчагі", у якім БМС паехаў далей з уважлівай чытачкай жаночых часопісаў — уверх? ці ўніз? — а ёй засталася пляцоўка

паміж паверхамі — *no man's land*, нічыя зямля. Вось толькі кніжку Юнга яна сабе пакінула, таму што была згодная з разуменнем чалавека як істоты не механістычнай, а загадкавай і *па-за часам*, якая ў крылатых снах узносіцца да свайго страчанага сапраўднага "я", адзінага і шчырага, якое адшукаць давядзецца і ёй, Вікторыі.

І тады страх назаўжды пакіне яе.

Усё, што з сябе выціскала па кроплі жоўта-зялёнага гною, а рана зноў і зноў ускрывалася свішчом, усё горшае, да чаго ў сабе ставілася з пагардай, гэтаксама было маміна, ад мамы навучанае, яе нязменнае "ласкавае цяля дзвюх матак ссе", калі, збіраючы яе на святочную лінейку першага верасня, маці загадвала дарыць букет толькі класнай кіраўніцы, і як пры гэтым трэба ўсміхнуцца, і што менавіта сказаць, каб цябе вылучылі з белафартуховага натоўпу, *запомнілі* цябе і твой букет, які маці прыдзірдіва выбірала, а потым брутальна таргавалася, шпурляючы напрыканцы бабульцы ў падол скамечаны рубель. Гэта таксама было адтуль — твар маці, пахмурна-зласлівы, яна цягнула Вікторыю па вуліцы ледзь не волакам, распякаючы за плямку ад марожанага на сарафане з такой лютасцю, нібы ад той плямкі залежаў, па меншай меры, запуск арбітальнай станцыі "Саюз", і як гэты твар раптам расцвітаў ялейнай усмешкай, намаляваным сонейкам з прамянямі-шчупальцамі, калі насустарч ім ішоў дырэктар завода, дзе маці працавала начальнікам цэха. І хваравітае імкненне *заслужыць* — пахвалу, дыплом, упамінанне ў дакладзе — было мамінай спадчынай... Ну, а *ўпасці* ў вачах "паважаных людзей" — лепш наогул не з'яўляцца на гэты свет! Калі пасля ўчарашняга правалу Куратар, характэрным жэстам

папраўляючы гальштук, бы зашмаргу, адмацярыў Вікторыю з Загадчыкам проста на плошчы, пры ўсіх, — першая яе, неўсвядомленая яшчэ ўзгадка была — пра маму: божачкі, што б яна сказала! І — другая, ужо цалкам усвядомленая: як добра, што яе няма.

*Жыў-быў заяц, і ўсяго ён баяўся…*

Не, не заяц — хутчэй шэрая мышка, — нездарма дырэктар кінапракату, мажная бабішча, упершыню пабачыўшы яе на нейкім фэсце (дагэтуль размаўлялі толькі па тэлефоне), змерыла здзіўленым паглядам: “Вы — Вікторыя Хоміч? А я ўяўляла вас гэткай культурысткай з біцэпсамі!” — гэтак ёй удалося нават голас свой аўтэнтычны заглушыць фанаграмай Упэўненай Пані! Калі яе шэсць год таму прызначылі дырэктарам гарадскога палаца культуры, дах “плакаў” па рамонце, так што на сцэне стаялі лужыны, а заслона нагадвала прасціну, на якой з месяц праваляўся ляжачы хворы. Лепшыя памяшканні папярэдні кіраўнік здаў камерсантам пад офісы, але арэндная плата не паступала, нахабныя дзялкі ў даўгіх чорных плашчах пхалі ёй банкаўскія квіткі на нейкія аплочаныя імі будматэрыялы, якія невядома дзе аселі, і Вікторыі давялося займацца скасаваннем дагавораў, апячатваць іх факсы-камп’ютэры, выслухоўваць сцэджаныя скрозь зубы пагрозы, але гэтых, падобных да прусакоў у сваіх аднолькавых плашчах, яна не баялася (ці не таму, што яны не належалі да катэгорыі “паважаных людзей”?). За першыя тры гады яе кіраўніцтва “захезаны” правінцыйны “дэка” выбіўся ў шэраг “лепшых культурных цэнтраў вобласці”, як рапартавала мясцовая раёнка. Дзіцячы танцавальны калектыў сталі запрашаць на міжнародныя конкурсы, самадзейны тэатр

атрымаў званне народнага. А потым пайшлі юбілеі мясцовых заводаў, так што прыведзеная ў “таварны выгляд” вялікая зала ледзь паспявала праветрыцца ад трэцегатунковай французскай парфумы, затое з’явілася капейка на рамонт даху. На ўрачыстым сходзе з выпадку восьмага сакавіка Загадчык назваў Вікторыю “міс Рашучасць”. А яна была проста выдатнай акторкай і хавала за фасадам лжывай асобы свой страх.

*Толькі б не ўпасці, толькі б не…*

Страх, як высветлілася, быў адзіным верным яе сябрам і палюбоўнікам. Спачатку яна — смешна ўспомніць! — спадзявалася, што БМС, прываблены яе новай значнасцю, вернецца, — ён і вярнуўся: па рэчы, павіншаваў яе з высокай пасадай: “ Заўжды ведаў, што ты жанчына дужая, ты вытрымаеш. А вось Галачка — яна слабая… паказала вугалок канапы, дзе сядзіць і плача, калі я на працы затрымліваюся…” Вікторыя і тады не заплакала, слёзы скамянелі пад павекамі. *Так, я — дужая. Я ўсё пераадолею.* Вось гэтак жа ў дзяцінстве, імкнучыся даказаць маці, што яна, Вікторыя — не “нікчэмнасць”, вызубрывала, бы вершы, параграфы ненавіснай фізікі, у якой анічога не цяміла, хоць плач, да світання сядзела за алгебрай — і атрымала такі медаль, няхай сабе срэбны, не залаты! Дарэчы, маці, пакуль яшчэ была жывая, заходзячы ў палац культуры, заўсёды знаходзіла, чым яе ўпікнуць: бруднае акно над лесвіцай (а яно спраектавана на чатырохметровай вышыні, прыбіральшчыцы баяцца залазіць!), п’яны заўгас, — і яна ўціскала галаву ў плечы пад градам здзеклівых фраз, нават, здаецца, меншала ростам — ну мышка і ёсць! — зусім як у дзяцінстве, калі маці распякала яе за дрэнна выкручаную бялізну, а ў яе проста не было, не было сілы яе выкручваць!

Вікторыя не любіла сваю дырэктарскую працу, хоць і рабіла яе на “выдатна”, як у школе — тую фізіку (па-іншаму проста не ўмела), а часам дык проста ненавідзела, як вось перад гэтым фэстам, што праваліўся: Куратар, прызначаны на “культурную” пасаду пасля станцыі юннатаў, дзе ён вырошчваў капусту на градцы, настойваў, каб дзеці ў фінале канцэрта вынеслі на сцэну прадукцыю мясцовых харчовых прадпрыемстваў: “Гэта спадабаецца гасцям!” — і Вікторыя доўга і “паліткарэктна” пераконвала ўладнага мужа ў абсурднасці ідэі, і сіл на гэта паклала забагата. У такія моманты яна выдатна адчувала, што ўсё гэта — не яе, зусім не яе.

Для ўдзелу ў “мерапрыемствах” яна з гідлівасцю ўлазіла ў даўгія спадніцы, апранала яркія строі, а ў штодзённым жыцці апраналася сціпла, *каб не заўважалі:* шэранькі касцюм, ніякай касметыкі, толькі памада, каб вусны не трэскаліся, а яна, між іншым, была прыгожая, з ладнай постаццю і выразнымі рысамі твару, праўда, крыху ацёклага з-за хваробы сасудаў (“Дзіўна — чаму ты не падкрэсліваеш лепшае ў сваёй знешнасці, як іншыя жанчыны?” — пытаўся БМС, калі яшчэ заўважаў тое лепшае, а потым і ён перастаў заўважаць — *брава, шэрая мышка-нарушка!).* Задумаўшыся тады над яго словамі, яна неўзабаве зразумела, што і тут, па прыкладу старажытных паляўнічых, спрабуе *заклясці страх,* падмануць злы лёс — каб не заўважыў, прайшоў узбоч, хапаў яркіх і стыльных. Што ж, яна і аказалася мышкай, якая трапіла ў жорны фабрычнай мясарубкі, і ёй пераломвала ўжо хрыбет, а яна ўсё яшчэ верыла ў выратавальную моц “ні пуха, ні пер’я”. І ў дырэктарстве тым, няхай яму ліха, калі падводзіць вынік (сакратарка, пэўна, ужо друкуе загад), не знайшла яна ніякай самарэалізацыі яшчэ і таму, што рэалізоўваць самасць

можна толькі ва ўмовах свабоды, а там, дзе патыхае страхам, там свабоды няма, няма.

Пах страху — гэта пах поту, што ніякім “дэзікам” не пераб’еш; яе праймала наскрозь гэтым асабліва ліпкім, атрутным выпарэннем, варта было настольнаму календару адкрыцца на беглым запісе “нарада — 14.00”. І тут ужо голас Упэўненай Пані рабіўся падталым, нібы гук на страціўшых зарад батарэйках, і ўнутры яе раздаваўся... нават не голас, не — утробны піск мышкі-нарушкі, што ліхаманкава мітусілася ў пошуках якой-кольвек дзіркі ў падлозе, бо ў актавай зале мясцовай адміністрацыі, дзе яна вымушаная была прысутнічаць па службе, да яе вяртаўся стары дзіцячы страх, як быццам бы яна зноў сядзела, намыленая, на лаўцы ў лазні альбо крочыла ў натоўпе дэманстрантаў пад выявамі правадыра. Пэўна, ні Франкл, ні Берн, ні іншыя “прасунутыя” сападары не здолелі б патлумачыць, якое ў тых сітуацыях мелася *падабенства,* хай яму спрахнуць, а яна — хіба яна была разумнейшая за іх? Адно Вікторыя ведала дакладна: усе гэтыя “карцінкі” з выявамі кіназалаў, піянерскіх лінеек, мітынгуючых плошчаў, будатрадаўскіх лазняў, электрычак і аўтобусаў, дзе яна калі-небудзь зведала страх *падзення*, перамяшаліся ў яе мазгах, бы адначасова ўстаўленыя ў праектар слайды, ствараючы фантасмагорыю кашмараў, дзе рысы рэальнага свету былі ўжо непазнавальныя. І дарэмна яна ўгаворвала сябе, бы тое малое дзіця, *не баяцца* — нехта ў ёй, дурны і палахлівы, не верыў даросламу разумнаму голасу. І яшчэ: у студэнцкія гады ўзровень страху, бы вада ў час прыліву, даходзіў ёй у горшым выпадку да падбароддзя, і яна магла дыхаць і нават плыць па-сабачы, рыўкамі; цяпер усё было значна

цяжэй: моташлівая каламутная жыжка накрывала яе з цемечкам — няўжо гэта і ёсць слынны крызіс сярэдзіны жыцця? Яна ўзнімалася на трэці паверх “белага дома”: лыткі дрыжаць, падпахі ўзмакрэлі...

*Божа, за што гэта мне?*

Перапоўненая зала, пчалінае гудзенне, — ад паскоранага сэрцабіцця звінела ў вушах, але вось тут дык і патрабавалася выклікаць з дыпкорпуса Упэўненую Пані: уперад, пасол! Для ўсіх Вікторыя была “вторым лицом в культуре”, і паводзіць сябе **абавязана** была — сляпое падпарадкаванне ролі, правінцыйны сіндром — адпаведна: “прыстойна”. Як мама вучыла.

Залу зачынялі цяжкімі дубовымі дзвярамі, і нібыта выбуховая хваля ўціскала яе ў чырвонае крэсла, усё плыло перад вачыма ад малатабойных удараў сэрца. Яна глытала таблетку рудатэля, працягваючы *бесклапотна* смяяцца з Намеснікам (“Што гэта ў вас?” — “Так, цукерачка”. — “Салодкая вы жачына!”), — па вопыту яна ўжо ведала (а як жа — яна вывучала сваю фабію, як інвалід вывучае сваё калецтва), што самая цяжкая — першая гадзіна. Потым стане лягчэй (цікава — чаму? цела перастройваецца на аварыйны рэжым, ці што?), а бліжэй да канца нарады нудлівае напружанне наогул знікне, пакінуўшы пасля сябе, бы параненых на полі бою, стомленасць у мышцах, як пасля цяжкай фізічнай працы, ды пакутлівы галаўны боль.

*Толькі б не ўпасці, толькі б не...*

Цыркавому акрабату, што трасецца ад страху сарвацца і нацягвае ўнізе сетку — вось каму прыпадабнялася Вікторыя на тых зборышчах, толькі сеткай была яе ўласная нервовая сістэма, нацягнутая да невыноснага напружання. І — абсалютна бессэнсоўна: калі сетка акрабата ўсё ж выратоўвае яго ў выпадку

падзення, з яе “сеткай” атрымлівалася якраз наадварот: чым мацней яна нервавалася, тым большай была верагоднасць, што страх спраўдзіцца. Цяпер ужо сам страх, а не слабасць сасудаў, стаў яе ворагам.

*Як перамагчы страх страху?*

Гэта стала галоўнай воссю, вакол якой круціліся яе думкі і памкненні. Яна яшчэ не жадала здавацца, яна ў адзіночку шукала спосаб адолець страх, узгадвала кніжных герояў, чыя перамога над уласным целам натхняла яе ў юнацтве. Чаму ж нічога не дапамагае цяпер? І куды падзелася яе воля? Зрэшты, воля якраз была пры ёй, пакуль што — пры ёй, гэта дзякуючы волі ёй удавалася не кідацца ў паніку, а Упэўненай Пані ўваходзіць у залу гарадской адміністрацыі. Але воля нічога не магла зрабіць з самім страхам: там, за межамі дзеяння волі, пачыналася суцэльная цемра, вуглы, зацягнутыя павуціннем, заваленыя спарахнелым хламам даўно памёрлых продкаў…

Наладзіць кантакт с той планетай душы, якая церпіць бедства, не ўдавалася, хоць плач. Спачатку Вікторыя спрабавала ўздзейнічаць на баязлівіцу ў сабе лагічнымі доказамі, як тое рабіў, прыкладам, Зошчанка (знакаміты гумарыст быў махровым неўротыкам, баяўся задыхнуцца ў працэсе ежы, сканаць раптоўна ад сардэчнага прыступу, — а Гогаль, той дык увогуле ні есці, ні спаць не мог, як усе людзі, і вось пытанне: што ж тады іхні гумар — гіперкампенсацыя штодзённага жаху?) Дарэчы, страхі нібыта развіталіся з сумным і няшчасным аўтарам “Вясёлых праектаў” і “Шчаслівых ідэй”, як толькі ён зразумеў іх “нелагічнасць”. Але яе, Вікторыны, страхі плявалі на логіку. У момант уяўнай небяспекі механізм страховачнай “сеткі” уключаўся аўтаматычна, бы нехта ў

ёй паварочваў да ўпору ручку тумблера, і колькі б Вікторыя ні паўтарала пра сябе загадзя падрыхтаваныя фразы — *я ўсведамляю, адкуль узяўся дурны страх, я дужэй за інфантыльны рэфлекс* — у адказ раздавалася адно толькі здзекліваe пахіхікванне. Вораг быў унутры яе, і яна ніяк не магла выклікаць яго вонкі, каб з ім памерацца сіламі, а на сваёй тэрыторыі ён перамагаў заўсёды, так, заўсёды. Аднойчы яна, узгадаўшы славуты метад парадаксальнай інтэнцыі, якім калісьці БМС спрабаваў лячыць яе “алергію”, далібог, цікавы метад — самой захацець здзяйснення таго, чаго баішся, — улезла, стрымліваючы зубны дробат, у перапоўненую электрычку проста так, у выхадны дзень, ёй нікуды не трэба было ехаць — пачуццё было такое, быццам бы яна гладзіць супраць поўсці звяругу, які пакуль толькі скаліцца і пагрозліва рыкае, але тут у вагон увайшлі некалькі чыноўных дамачак з яе атачэння, і ўяўленне адразу ж намалявала карціну яе падзення на запляваную падлогу, кісла-салодкія ўсмешачкі, спачувальныя пагляды... на бліжэйшай станцыі яна выйшла.

Потым Вікторыя змяніла тактыку. Убіўшыся ў аўтобус — зразумела, перапоўнены, іншыя для яе мэты проста не падыходзілі — яна ў думках выбірала з цяжка дыхаючага натоўпу чалавека, *здольнага да спачування.* Гэта было нескладана: тыя, хто ездзіць не на службовых “Волгах” і, вядома ж, не на ўласных “мерсах”, звычайныя пасажыры грузных разваліная з прадранай гумай “гармоніка”, скрозь якую за каўнер ляцяць пырскі дажджу ці снегу, а сядзенні нібыта доўга дралі ікламі дзікія драпежнікі, — усе тыя маршчастыя бабулькі з неабдымнымі клункамі, напакаванымі цаглінамі хлеба, ці з накрытымі чыстай анучай кашамі, з якіх раздаецца папіскванне куранят, тыя дзядзькі ў

брудных ватоўках здаваліся ёй больш спагадлівымі, чым яе выглянцаваныя наменклатурныя калегі. І ўсё ішло гладка, пакуль які-небудзь “белы каўнерык” не праціскваўся ў аўтобус.

Быў час, калі яна размяркоўвала ўпадабаныя ёю думкаформы па днях тыдня. Так, у панядзелак па дарозе на працу казала сабе, што людзі, па сутнасці, добрыя і спагадлівыя; у аўторак — што ёй увогуле пляваць і яна не абавязана нікому падабацца; у сераду вызначала, што страх — эмоцыя неканструктыўная: а раптам нічога не здарыцца — тады, выходзіць, дарэмна баялася; у чацвер канстатавала, што ёй надакучыла баяцца — і ўсё тут; у пятніцу высвятляла, што чым карацей і афарыстычней думкаформа, тым лепш яна ўздзейнічае. Вось гэтая фраза: “*ніхто мне не суддзя*”— дазволіла, абапіраючыся на яе, бы на мыліцу, у суботу патаўхацца на базары і зрабіць неабходныя пакупкі. Думка яе ўвесь час блукала ў пошуках ідэальнага афарызма-ключа, які падыдзе да “замка”, раз і назаўсёды адчыніць падвалы падсвядомасці, але трапляліся нейкія аднаразовыя адмычкі. Неяк яна стаяла, страшна напружаная, на аўтобусным прыпынку, механічна чытала прыклееныя да слупа аб’явы, і раптам на вочы трапілася: “Прадаецца каўказец, кабель”, — божачкі, ці ж можна усур’ёз успрымаць людзей, што пішуць падобныя тэксты, не ўлоўліваючы падтэкстаў? У аўтобусе яна нават развесялілася, спрабуючы ўявіць сабе аўтара аб’явы, пэўна, гаспадара двухпавярховага цаглянага катэджа з безгустоўнымі вежкамі, аматара пакалупацца запалкай у зубах пасля чарговай оргіі стрававання. Шкада толькі, што “адмычкі” былі недаўгавечныя: назаўтра даводзілася шукаць новыя формулы.

Між іншым, дзякуючы таму “каўказцу”, да Вікторыі, нарэшце, дайшло, чаму не спрацаваў славуты метад парадоксу: хацець ажыццяўлення свайго страху патрабавалася **з гумарам** — вось у чым была ўся справа! Яна ж сябе ад роду-веку памятала проста такі паталагічна сур’ёзнай. Зрэшты, асобны род гумару быў і ёй зразумелы, думала Вікторыя ў самыя чорныя свае хвіліны: прыкладам, той смяшок, з якім Калігула адказаў закаванаму ў кайданы рабу, што папрасіў у аўгусцейшага імператара смерці, — не дакранаючыся да мяча, Калігула філасофскі зазначыў: “Хіба цяпер ты — жывеш?”

Вартае ўвагі пытанне.

Хіба жыве насамрэч закаваны ў кайданы раб, які на “ўвесь свет вялік” у парыве самапрыніжэння тлумачыць: “Я мужык, дурны мужык”? Ідэальны сеанс лінгвакарэкцыі, між іншым. Бо калі доўга прымушаць дзяцей паўтараць нейкую рытмічна арганізаваную фразу, прычым, паўтараць так, каб яна *клалася на душу*, то такая “афірмацыя” кадзіруе псіхіку лепей за любую ідэалогію, балбатню якой мы звыкла прапускаем міма вушэй. І без таго ў нас зашмат тых, хто нясе знутры на сятчатцы вока вобраз сябе, дурнога і няўмелага, якім “кожны пагарджае”, і, гледзячыся ў гэтае люстэрка, несвядома падганяе арыгінал пад адбітак. Дастаткова прайсціся, прыкладам, па вуліцах ды хаця б іхняга правінцыяльнага гарадка: насустрач трапляюцца мужчыны з ватнымі, як пасля глыбокага наркозу, тварамі, у нязменных спартовых нагавіцах і нібы на сметніку знойдзеных чаравіках, з нейкім агульным выразам інфантыльнага неўразумення на выцягнутых па-авечаму, няголеных тварах, якія ажыўляюцца адно пры характэрным гуку, які суправаджае перамяшчэнне

вадкасці з бутлі ў гарляк; жанчыны, рана звялыя, горы цеста, за якімі ледзь пазнаюцца танюткія дзяўчынкі з выпускнога фотаздымку, зробленага на доўгую памяць — аксамітнай “кніжачкай”, з нейкай старэчай безнадзейнасцю ў вачах яшчэ цягнуць на сабе, лічы, усё: працу, дзяцей, паваляку-мужа, грымучы мацярынскі інстынкт вывозіць, а мужчыны ўвогуле апусціліся, прыціснутыя *страхам перад будучым.*

Чалавек жыве да тых пор, пакуль чагосьці чакае; калі ж у будучым адно безвыходнасць (вобраз-адбітак “дурня” на сятчатцы, нашэптванне ўнутранага суфлёра), ён перастае быць адкрытым да жыцця, становіцца нібы цэмент, які “схваціўся”, застыў. Становіцца лёгкай здабычай страху. І тады пачынаюцца алкаголі, траўмы, рак, суіцыды — ніколі яшчэ з часоў вайны не памірала па-дурному столькі маладых мужчын! Неяк, гартаючы мясцовую “раёнку”, якая дзеля прыцягнення падпісчыкаў стала друкаваць штотыднёвую статыстыку, так бы мовіць, кардыяграму жыцця райцэнтра (нарадзілася 8 дзяўчынак і 13 хлопчыкаў, памёрла 32 чалавекі, паступіла ў траўмапункт 96 : збітых — 23, з нажавымі раненнямі — 15, суіцыды — 13... ), Вікторыя зрабіла просценькі падлік і жахнулася: каля чатырох дзесяткаў замахаў на самагубства штомесяц у іхнім параўнальна невялікім гарадку! А потым ёй трапілася на вочы заметка, распаўсюджаная, між іншым, афіцыйным інфармацыйным агенцтвам:

***Псіхічнае здароўе патрабуе ўвагі***

*Беларускія медыкі занепакоены вялікай колькасцю суіцыдаў, што адбываюцца ў краіне, якія выйшлі на трэцяе месца ў паказчыку смяротнасці насельніцтва. У мінулым годзе,*

*напрыклад, добраахвотна развіталіся з жыццём больш за тры тысячы чалавек.*

Вучыць людзей *не баяцца* — вось што тут трэба, думала Вікторыя. **Народ, які баіцца будучага, не выжыве.** Але, каб процістаяць страху, трэба найперш павытраўліваць на ўнутранай паверхні сятчаткі вобраз раба, упэўненага ва ўласнай нікчэмнасці ("Нікчэмнасць, дрэнь!" — як свярбіць гэта, у плоць і кроў урэзанае *веданне*!) і, насуперак таму, чаму нас вучылі, стварыць унутраны партрэт... не пераможцы, не (бо — адкуль?!), а хаця б — змагара. Нават калі ты асуджаны на асабістую паразу і ведаеш гэта. Так, нават тады. Змагацца з уласным пачуццём безвыходнасці, неяк актыўна **дзейнічаць** па паляпшэнні свайго становішча. Хіба ж не сутаргавымі, напачатку бязладнымі рухамі — абы не патануць! — выцягвалі сябе з багны іншыя народы, як тая слынная жабка, што збіла смятану ў масла, спрабуючы выбрацца з пасткі? Але талерантныя беларусы абралі свой спосаб "бунту": калектыўны зыход у небыццё. І нашае пагрозлівае "стрэльбы, хлопчыкі, бяры!" абарочваецца банальным забойствам: *пасля сумеснага распіцця спіртнога сякерай рассёк свайму бацьку чэрап... муж нанёс жонцы 12 нажавых ран, ад якіх кабета сканала... мужчына на падпітку падпаліў уласную хату, у якой спалі двое ягоных дзяцей, а сам пайшоў у пуню і засіліўся...* Гэта ўсё з тых жа зводак у мясцовай газеце. Так беларус распраўляецца са сваім мінулым, што падманула, цяперашнім, у якім ён не бачыць сэнсу і з будучым, якога баіцца...

Быў такі псіхолаг — Віктар Франкл, БМС калісьці захапляўся яго метадамі лячэння. У час другой сусветнай Франкл апынуўся ў фашысцкім канцлагеры, але выжыў і стварыў цікавую тэорыю аб

сэнсе жыцця — пэўна, пра такія рэчы якраз і думаецца за калючым дротам, пад брэх аўчарак, калі назіраеш за пальцам эсэсаўца на спускавым кручку. Ва ўсялякім выпадку, на гэтае дзецішча Франкла яўна падае цень барака ўзмоцненага рэжыму. На ягоную думку, сэнс чалавечаму жыццю надае рэалізацыя каштоўнасцей, якія адносяцца да адной з трох груп: стваральныя, што палягаюць у сферы прафесійна-творчай, эмацыянальныя (любоў) і нарэшце так званыя “каштоўнасці адносін”. Апошнія, згодна Франклу, робяць асэнсаваным жыццё ахвяр — вязняў канцлагера альбо невылечна хворых, карацей, усіх тых, каму недаступныя творчасць ды каханне. Адзіны сэнс жыцця, які можа вынайсці ахвяра цяжкога лёсу, — гэта прымірэнне з ім, у чым і палягае, лічыў Франкл, “свабода ўсіх няшчасных і абяздоленых”. І ўсё выглядала б па-хрысціянску цудоўна, калі б не вось гэтая правакацыйная думка аўтара: “каштоўнасці адносін — найвышэйшыя з магчымых, а сэнс мучэння — найвышэйшы з усіх сэнсаў”. Вось яна — любоў ахвяры да ката, пакутніка — да сваёй пакуты, па-іншаму гэта называецца ма-за-хіз-мам, блізкае нам, калі не сказаць, роднае светаадчуванне. Спалілі кніжкі Маркса і дружненька сталі пацыентамі Франкла. Цэлы народ жыве “каштоўнасцямі адносін”, моўчкі пакутуе і ціха вымірае, і ўсё таму толькі, што загадзя *прыняў сітуацыю як безнадзейную*. Але ж гэта — недарэчная падмена, бо Франкл перасцярагаў ад спакусы скласці зброю, калі яшчэ што-небудзь можна змяніць! Бо “каштоўнасці адносін” — сапраўды выратаванне толькі для тых, каму ўжо не засталося аніякай надзеі.

Дык няўжо ж у народа музыкаў і закаханых анічога не засталося наперадзе, акрамя страху? І яму, як таму закаванаму ў

кайданы рымскаму рабу, застаецца адно прасіць смерці як літасці, як адзінага плёну жыцця?!

Не, Вікторыя не хацела прыняць “каштоўнасці адносін”. Пакуль — не, казала яна сабе, змагаючыся са страхам, шукаючы ўсё новыя і новыя спосабы пераадолець яго, і на ўсю гэтую буру ў шклянцы вады траціла столькі сіл і вынаходлівасці, колькі хто іншы паленаваўся б патраціць на пытанне, як кажуць, жыцця і смерці, — што ж, гэта і было для яе такога кшталту пытаннем, а між тым гаворка ішла ўсяго толькі пра тое, каб увайсці ў залу пасяджэнняў ці аўтобус! Зразумела, ніхто з яе калег па працы, якія звыкла бачылі ў ёй Упэўненую Пані, і ўявіць сабе не мог, **што** хаваецца за яе заўсёды аднолькава-прыязнай усмешкай. Д’ябальская іронія была ў тым, што лепей, чым хто-небудзь, Вікторыя **разумела** абсурдную перабольшанасць свайго страху, яго абсалютную бязглуздасць.

*Не, не вытрымаю, больш — не вытрымаю…* У перапоўненай зале з зачыненымі форткамі — ні шчылінкі для свежага паветра! — яна сядзела з выразам дзяжурнай увагі, зацвярдзелым на твары, нібыта пасмяротная маска. З тых пасядзелак выпаўзала знясіленая, кожным нервам адчуваючы, што непатрэбная “страховачная сетка” зусім небясшкодная: гіперабарона вядзе да мабілізаванасці рэсурсаў цела, рэзкага выкіду адрэналіну; ўсё гэта перагарае, гніе незапатрабаваным (небяспека ж уяўная!), і кроў надоўга аказваецца атручанай ядамі страху. Раней, у юнацтве, гэты збой кампенсаваўся хутчэй, цяпер жа пасля такога ўзрушэння рэха страху яшчэ доўга будзе гучаць па ўсіх пячорах і гротах цела, знясіленага хранічнай абаронай, і аднойчы яе хворыя сасуды могуць проста не вытрымаць. Першы званочак ужо быў —

вострае парушэнне мазгавога кровазвароту, яна тады тыдзень правалялася ў лякарні, і ёй настолькі спадабаўся стан адасобленасці ад усіх праблем, безадказнасці і расслабленасці — нібыта ў матчыным (не — Гасподнім!) лоне — што яна, не давяраючы таму ідыёту, які сядзеў у суфлёрскім буданчыку яе падсвядомасці, — а раптам ён упадабае ложак у лякарні і "арганізуе" ёй, прыкладам, аўтакатастрофу? — пасяшалася выпісацца, нягледзячы на лямант урачоў, не прайшоўшы курс лячэння да канца.

І цяпер галава баліць так, нібы ў ёй выбухнуў узброены канфлікт дзвюх арабскіх дзяржаў — вось і ў левым вуху пастрэльвае... Нічога, дома яна вып'е лекі, што далі ўрачы, і знікне гэты пакутлівы боль, які ўключыўся ўчора, якраз пасля фэсту, калі Кіраўніца затрымалася ля іх з Загадчыкам (Вікторыя ўбачыла, як той стаў проста такі імкліва памяншацца ў росце, пакуль не ператварыўся ў гарбатага гнома з уціснутай у плечы шыяй) — ярка-кумачовыя вусны варушыліся, вымаўляючы нешта злосна-пагардлівае, адрывістае, свядомасць фіксавала асобныя фразы: безадказнасць... не адпавядаеце пасадзе... ("Нікчэмнасць! Дрэнь!" — уключылася ў памяці, аж замігцела каляровымі лямпачкамі, як на пульце кіравання падаючага самалёта), і калі Вікторыя ўзняла вочы, замест расчырванелага твару Кіраўніцы ўбачыла іншы твар...

## Частка другая

На фотаздымку маці, які вісеў на дошцы гонару ля будынка гаркома партыі, Вікторыю ўражвала менавіта адсутнасць прасторы; змярцвела-лабараторнае, нібыта замарожанае святло фотамайстэрні абцякала высокую прычоску, гладкі, бы адпрасаваная прасціна, лоб, за якім, на першы погляд, проста не магло хавацца неадпаведных эпосе думак ды пачуццяў. Аднак у дзяўчынкі меўся іншы фотаздымак, пажоўклы, загнуты з ражкоў: твар маладой жанчыны напаўпрыкрыты каскадам густога валосся, што віецца, бы дзікі вінаград, на фоне якога яна стаіць, сарамліва пасміхаючыся, прыціскаючы да грудзей кацяня. Вакол яе пульсуе і дыхае прастора, атожылкі вінаграднай лазы, здаецца, прарастаюць у будучыню скрозь загусцелае паветра здымка. “Што за акторка?” — дзелавіта цікавіліся сяброўкі, і як было прызнацца, што гэтая пеннавалосая німфа ў лёгкай адкрытай сукенцы са спушчанай брэтэлькаю — яе маці, звыклая госця школьных лінеек, якая абрыдла крычыць у мікрафон фразы пра радзіму ды партыю, але найчасцей — пра доўг, доўг.

“Доўг” — гэта было галоўнае слова ў яе лексіконе і найпершая каштоўнасць у шкале дабрачыннасцей, зразумела, для людзей — суседзяў, калег па працы, начальства. “Вось, жыву дзеля дзяцей, бо гэта мой доўг”, — паважна казала яна заўсёднікам дваровых лавачак. Вікторыя з маленства засвоіла: яны з сястрой для мамы — непажаданае ярмо, якое даводзіцца несці, бо здаваць “выблядкаў” у дзетдом, як гэта рабілі калісьці жанчыны-камісары, каб быць вольнымі для рэвалюцыі ды жарсці, зараз лічыцца “непрыстойным”. “Прыстойнасць” — гэта было другое ўлюбёнае маміна слова-фетыш (як у БМС — “асалода” ды “шчасце”, што ні

кажы, мяняецца эпоха — паднаўляецца слоўнік паняццяў), менавіта аб прыстойнасці палягала клапаціцца перш за ўсё, а калі нешта выходзячае за яе межы ўсё ж такі адбывалася, трэба было любым шляхам хаваць гэта ад чужога вока, якое сачыла за імі, драпежна-цікаўнае, прыпадаючы да замочнай шчыліны кватэры.

Аднойчы ў суботу — Вікторыі ішоў тады дванаццаты год — яна вярнулася са школы і знайшла маці, якая неахайна раскінулася на ложку, цяжка і хрыпла дыхаючы; гарэлачны пах, змешаны з нейкім іншым, моташліва-салодкім, плыў па кватэры, і дзяўчынка не адразу высветліла крыніцу нязвыклага паху: выкіпелая кава, разліўшыся па пліце, пагасіла полымя канфоркі, з якой выпаўзаў з ціхім шыпеннем газ. Яна тады выключыла пліту, адчыніла акно; моцна хацелася есці, але на стале замест абеду размясціўся брыдкі нацюрморт: пустая бутэлька з-пад гарэлкі, раскурочаны батон ды бляшанка з рэшткамі чырвонай ікры. Плямы расціснутай ікры былі і на падлозе, і на матчыным ложку, — прыгледзеўшыся, Вікторыя выйнайшла, што гэта кроў. Ад нудлівага жаху падкасіліся калені. Яна набілізілася да ложка — маці дыхала ў сне, значыць, была жывая... Можа, ёй патрэбна дапамога? Сітуацыя відавочна вымагала нейкіх дзеянняў: паклікаць суседзяў, патэлефанаваць у "хуткую", але п’яная маці, пах газу — усё гэта было **непрыстойна**, і спалоханая дзяўчынка, вядома ж, не была ўпэўнена, што тая станоўча аднеслася б да прысутнасці ў доме чужых. У рэшце рэшт, яна вырашыла пабудзіць маці, каб тая, дарослая і вопытная, сама падказала ёй, што рабіць. "Мама-а-а!" — наўмысна гучна плакала яна, укленчыўшы ля ложка. У калысцы прачнулася і заверашчала малая. Маці ўзняла з падушкі азызлы твар, які адразу ж сказіла грымаса лютасці: "Гэта ты ўва ўсім вінаватая, б.....! З-за цябе ён

кінуў нас, з-за цябе!" Выпрастанай з-пад коўдры рукой маці ўдарыла дачку па твары так моцна, што ў тае пайшла носам кроў.

...Ёй споўнілася дзевяць, калі бацька, ціхі, з вузенькімі, бы ў падлетка, плечыкамі і надта вялікім кадыком, быў вытураны з толькі што атрыманай двухпакаёўкі, на якую з-за яе, сваёй Вікусі, не стаў прэтэндаваць, а маці кінулася ў пошукі рамантычнага героя, які неўзабаве з'явіўся ў вобразе каржакаватага дзецюка, рыжавусага і рабацініставага, з жалезным пярэднім зубам і абсалютна пазбаўленымі выразу, бы керамічнымі, вачамі. У "героя", між іншым, меўся істотны недахоп: ён быў жанаты. Некаторы час доўжылася "перацягванне каната" паміж старой і нованароджанай ячэйкамі грамадства; умацаваць матчыны пазіцыі мусіла з'яўленне на свет дзіцяці, аднак рыжавусы, які чамусьці неўзлюбіў Вікторыю, паставіў умову: "дзеўку" аддаць на выхаванне бацьку. Сама дзяўчынка нічога так горача не жадала, але маці адхіліла "непрыстойную" прапанову ("Што скажуць людзі?!"). У выніку дзядзька адбыў у ранейшую сям'ю, дзе ў яго падрастаў такі ж рабаціністы сынок.

Камень віны, які зваліўся на дзяўчынку ля матчынага ложка, па чыстай выпадковасці не пераламаў ёй хрыбет. Але нармальны рост яе перапыніўся — дарослая Вікторыя гэта цяпер добра разумела, — і на месцы ўдару пачаў расці нябачны горб. Працягваючы падвываць, ужо ціха, каб зноў не пабудзіць маці, якая адразу ж і заснула, яна выцерла плямы крыві (месцамі з праселай падлогі вытыркаліся шляпкі цвікоў — аб іх маці і паранілася, швэндаючыся па кухні басанож), схавала бутэльку і рэшткі ікры, выгляду і паху якой з таго часу не выносіла. Накарміўшы і паклаўшы спаць малую, яна забілася ў свой вугал

за крэслам і прасядзела там да рання, калоцячыся ад холаду і страху, што маці прачнецца і зноў будзе яе біць…

Але маці больш ні разу не ўдарыла яе — так, ні разу. Яна выбрала іншы від катавання: словы. Ах, лепш бы яна лупіла яе чым папала! Але, як звер беспамылкова вызначае слабае месца ў ахвяры, маці распазнала ў дачцэ звышадчувальнасць менавіта да **слова** (так іншы чалавек бывае асабліва адчувальны да фізічнага болю). Прылады катавання розніліся ў залежнасці ад настрою ката — ад пякучай пугі іроніі, якой маці пагульвала амаль юрліва, да жалезных ціскоў праклёну, у якіх храбусцелі косткі. Так, будучы ў гуморы, яна пераказвала Вікторыі вычытаныя ў газетах гісторыі пра хлопчыкаў ды дзяўчынак, якія ў трынаццаць год перамагалі ў чэмпіянатах, а ў шаснаццаць абаранялі дыпломы па марксізму. “Ёсць жа шчаслівыя бацькі, — крывадушна ўздыхала яна, — а ў мяне дачка — нікчэмнасць”. Абавязкам Вікторыі было дабіцца нейкай неверагоднай ступені дасканаласці, якой людзі ў прыродзе сваёй не валодаюць, — толькі такая, без пылінкі ды плямкі, дасканаласць здольная была ўраўнаважыць цяжар ахвяры, якую маці прынесла дзеля яе, адмовіўшыся ад асабістага шчасця. Прынамсі, так яна, дурнічка, думала, бо з той п’янай суботы ўпячатанае ў падкорку таўро віны вызначала ўсе яе ўчынкі, нібыта магніт, пакладзены пад компас. Гэта цяпер — толькі цяпер! — Вікторыя зразумела: маці змахлявала, бы цыганка на базары, яна проста падманула дачку, пераклаўшы на яе кволыя плечы ўласную дарослую ношу. Вядома ж, маці сама была няшчаснай — і тады, калі “лячылася” гарэлкай ад болю, і пазней, калі знайшла паратунак у партыйнай рабоце.

Але ці дае ўласная, няхай горкая, пакута права скалечыць іншую, ні ў чым не вінаватую істоту?

Не і не, не зможа шырма для споведзі замяніць ласкавае калыханне аксамітнага і пераходзячага, а анемічны постсавецікус псіхааналіз — перахапіць тую слынную гістарычную ролю партыі: служыць рысталішчам замешчанай актыўнасці бязмужніх жанчын з уладнымі амбіцыямі. Ім у першую чаргу, а не старцам з устаўнымі сківіцамі, да твару аплакваць былую эпоху, якая давала абдзеленым любоўю, пакрыўджаным жанчынам неверагодную магчымасць **адыграцца.** Гэтыя думкі — як лінза, скрозь якую Вікторыя разглядвае, спасцігае цяпер сваё гаротнае дзяцінства, якое прыйшлося, дарэчы, якраз на сямідзесятыя, калі партыйны эгрэгар, хоць і з нарумяненымі шчокамі ды адрузлымі мышцамі, быў яшчэ здольны ўлагодзіць *libido* згаладнелых правінцыяльных цётак. І маці кінулася ў грамадскія ігрышчы, як іншыя — у разгул. Яна назаўсёды выключыла са свайго жыцця свет эмоцый, што здрадзіў ёй: так асцярожная паддоследная пацучыха, атрымаўшы ўдар элекрашокера, больш не набліжаецца да прынады, у адрозненне ад сваіх дурненькіх сяброўак. З асалодай калекцыяніравала маці знакі ўвагі свайго міфічнага імпатэнтнага "палюбоўніка": усе гэтыя ціснёныя золатам граматы, бразгучыя медалькі з выявамі правадыра — яна раскладвала бліскучае барахло на стале, і твар яе свяціўся замілаваннем... А дзеці, дзеці, якім так патрэбны былі яе любоў і падтрымка?! Ды што дзеці... Дзеці мусілі вырастаць роўнымі шэрагамі на пляцоўках школ ды стадыёнаў, як аднолькава падстрыжаная трава на газоне, пад гукі фанфар і "рачовак", і пры гэтым быць дыстылявана-ідэальнымі: дзецьмі, за якіх "не сорамна".

Часам, вярнуўшыся дадому пасля партсходкі ці дэпутацкай сесіі, маці садзілася перад люстэркам і нібыта ўпадала ў цяжкую здранцвеласць. Штосьці лішняе, непатрэбнае — зморшчынка на гладкім лбе (калі выкрывала няверных мужоў, даводзілася хмурыцца), звялая ружа, пустая каробка з-пад цукерак з легкадумным малюнкам — раптам узнімалі з падводных глыбіняў памяці, як твар тапельніцы Алёнушкі са дна, тую маладую жанчыну з валасамі, як дзікі вінаград, — жанчыну, якая марыла зусім не пра бразгучыя медалькі ды граматы. Паміж “гістарычным аптымізмам савецкага народа” і яе сапраўднай будзённасцю ўтваралася пустэча, у якую свістаў вецер адчаю. І яе лютасць скіроўвалася на пахмурную звераватую дзяўчынку, якая — вось жа ўпартая дрэнь! — ніводнага разу не заплакала, не прылашчылася да маці, як малодшая дачка, — ну вядома ж, гэтай жывёліне ўсё матчына абурэнне — што гарох аб сценку, так як і разгэтак! Маці і ў галаву не прыходзіла, што дзяўчынка кожнае ейнае ў гневе кінутае слова прымае **ў сябе**, у тую найглыбейшую глыбіню, дзе сплятаюцца карані лёсу, жывяцца цудоўнай вільгаццю, прызначанай для творчасці ды кахання; што ад злоснага мамінага крыку тое вільготнае дно ператвараецца ў ссохлую пустэчу, на якой можа вырасці толькі страх і недавер да людзей... А чаму, чаму яна так зацята маўчала, седзячы, бы ваўчанё, у сваёй схованцы за крэслам? Чаму не пярэчыла, не апраўдвалася? Ды таму, што была ўпэўненая ў неабдымнасці сваёй віны: усё так, мама мае рацыю (ды і хіба можа мама — памыляцца?!), яна, Вікторыя, — нікчэмнасць, поскудзь... яе ніхто ніколі не палюбіць... а маці, раз’юшаная яе маўчаннем, не магла ўжо спыніцца і асыпала “ідыётку” праклёнамі. Зрэшты, часам “шкадлівая дзеўка” ў час гэтых слоўных экзекуцый падала, бы

падкошаная, на падлогу, і маці, упэўненая, што “істэрычка” ўзяла манеру прытварацца, пакідала пакой, бразгаючы дзвярыма так, што асыпалася тынкоўка...

Зачыніць дзверы на ключ, прылегчы на канапу, падкласці пад шыю скручаны валікам ручнік, расслабіцца і памасіраваць кропкі “неадкладнай дапамогі” на лбе і на скронях, як вучыў яе БМС, — вось што зараз трэба зрабіць замест таго, каб корпацца ў гнойнай ране свайго дзяцінства, быццам адвёрткай у тых болевых кропках калупацца, голымі рукамі, без наркозу, выцягваць скрываўлены **корань страху**... Але ж — усё роўна палезлі ўжо ўспаміны, нібы вятры з развязанага матросамі меха, і запозна Адысею хапацца рукамі за галаву, як бы яна ні балела...

Не так даўно, можа, месяц таму, Вікторыі прыснілася, як яна раскапвае маміну магілу, рукамі разграбае мокрую клейкую зямлю, пакуль не дабіраецца да мамы, якая неахайна раскінулася ў яме, цяжка і хрыпла дыхаючы, як дваццаць гадоў таму, і Вікторыя, укленчыўшы на купе чорнай зямлі, у роспачы спрабуе пабудзіць маці, а тая раптам хапае яе за валасы, нечакана густыя і даўгія, як на даўнішнім маміным здымку (вось чаго не атрымала ў спадчыну Вікторыя — ейных прыгожых валасоў), а пасля цягне ў раскрытую ямішчу, зусім як кашчавы шкілет — аголеную прыгажуню на карціне Ханса Б. Грына “Смерць і дзяўчына”, і вось ужо Вікторыя ляжыць у магіле замест мамы, а мама, невядома як завалодаўшы ейнымі целам і душой, жыве замест дачкі яе жыццё... Прачнулася тады ў халодным поце, абмацала сябе, каб ўпэўніцца: гэта — я, насамрэч — я.

Калі гэта адбывалася **без сведкаў** — прыкладам, у час купання, у перанасычаным парай паветры ваннага пакою (ваду маці налівала нясцерпна гарачую — “няхай гразь адмокне!” — нібы Вікторыя за тыдзень зарастала нейкай асабліва ўчэпістай граззю), яна не баялася, зусім наадварот: ёй было лёгка і прыемна некуды адплываць, адчуваючы сваё трапяткое, а потым вокамгненна абмяклае, зніякавелае сэрца; сузіраць, як бляклая туманнасць люстранога шкла, на запацелай паверхні якога так зручна пальцам выводзіць сваё імя, пачынае раптам мільгацець рознакаляровымі іскрамі. Ува *што* можа аднойчы выліцца яе “плаванне” у гарачай ванне, яна, вядома ж, ведала, але ёй было ўсё роўна. У тым свеце, куды яе змывала хваля млосці, існавалі чамусьці толькі два колеры: чорны і аранжавы. Цень, які насоўваўся на зрок *адтуль,* быў жывы: у ім сыходзіліся і разыходзіліся зменлівыя плямы, чарноцце вібрыравала вогненнымі сполахамі, нібыта ў глыбіні таго ценю цемечкам немаўляці пульсавала самастойная сонечная кропка, якая раптам расла, пашыралася, і тады нейкія светлавыя каметы кветкамі раскрываліся ў змроку — і зноў усё захіналася мглой. Па гэтым вогненным кіпені яна навучылася прадбачыць стан непрытомнасці і да апошняга марудзіла паклікаць на дапамогу. Што было потым, калі чорна-аранжавыя бурбалкі раптоўна знікалі, і яна ляцела ў глухі калодзеж без дна? Вікторыя не ведала. Відавочна, потым была смерць — маленькая і абарачальная, але зусім, зусім сапраўдная. Гэтым часам яе звычайна пераносілі з ваннага пакоя, дзе зачыняцца ёй не дазвалялася, на ложак — там яна і прыходзіла ў сябе. Дзе яна толькі што пабывала? І што адбывалася тут без яе? Смерць, думала дзяўчынка, па сутнасці, цудоўная рэч, бо ў ёй няма ні сораму, ні страху.

І калі раз'юшаная маці праклінала яе, Вікторыя востра жадала памерці, і, здаралася, нехта кідаў ёй са змроку чорна-аранжавы выратавальны круг. Можа, такім чынам дзіцячая свядомасць абаранялася ад жаху будучага, якое пад уплывам маміных праклёнаў — Вікторыя гэта дакладна адчувала — зрушвалася з месца і перайначвалася. Бо тыя праклёны мелі асаблівую сілу. Калі маці выплёўвала іх даўкім ад нянавісці голасам, над галавой дзяўчынкі са страшэннай хуткасцю раскручвалася свісцячая спіраль, нябачны смерч, і на гэта гукабаляванне зляталіся дэманы — яна ясна чула шум скрыдлаў. Ах, лепш бы маці ўдарыла яе, збіла ў кроў! Яе праклёны, бы сляпыя цыклопы, шпурлялі ў дзяўчынку, маленькую і трымцячую, цэлымі скаламі. Час згушчаўся над яе цемем, рабіўся непразрыстым, імкліва страчваючы ружова-блакітны колер, на вачах ператвараўся ў біблейскі "сасуд смерці" — і толькі смерцю яна магла ад яго абараніцца. Вяртанне ў свядомасць пасля матчыных слававывяржэнняў было цяжкім: Вікторыю пакутліва ванітавала, проста такі выварочвала, а потым, знясіленая, яна забівалася ў свой вугал паміж крэслам і падаконнем, дзе ўпадала ў дзіўнае здранцвенне; у гэтым напаўсне-напаўяве яе праследавалі жудасныя ўяўленні-вобразы, так што, апрытомнеўшы апоўначы, яна не адразу магла зразумець, якая з дзвюх рэальнасцяў сапраўдная, а якая — толькі адбітак першай у мутным люстэрку кашмару.

Дарэчы, маці не толькі ні разу не паказала яе ўрачу, але кожнае лета пхала — "каб выйшла дурасць!" — у піянерскія лагеры на тры змены, дзе Вікторыя знемагала ў духаце камунальных душавых і на санцапёку лінеек. Менавіта там у яе розуме, бы чырвоная кнопка трывогі, і замігцела тая думка:

*толькі б не ўпасці, толькі б не…* Менавіта там, дзе было столькі патэнцыяльных сведкаў яе ганьбы, яна пачала адчуваць страх перад падзеннем і кантраляваць свае рэакцыі, бо яшчэ не ведала: смерць, няхай сабе маленькую і абарачальную, пракантраляваць нельга.

Фотаздымак маладой прыгажуні з валасамі, як дзікі вінаград, яна схавала ў нейкую кнігу, а потым згубіла. Ды і ці быў ён наогул? Пасля смерці маці ў Вікторыі засталіся толькі здымкі, зробленыя заводскім фатографам. На іх тая нібыта ў масцы, застылай, як гіпсавы барэльеф правадыра над яе галавой, але пад той маскай — нават пажоўклая фотапапера не магла схаваць гэта — скажоны пагардай і гневам твар, змяінае шыпенне ярка-кумачовых вуснаў: “Каб ты **правалілася,** праклятая!”

У міфах многіх народаў матчына лона — сімвал раю. Страчанага, трэба заўважыць, раю, бо Адам, пакінуўшы Боскае лона, вымушаны быў стаць дарослым і прыняць адказнасць за сваё жыццё на сябе. Праўда, адначасова ён набыў свабоду. Рай, як любая таталітарная сістэма, свабоды пазбаўлены па азначэнні. Таму, нягледзячы на цяжкасці дарослага жыцця, дзіця звычайна аддае перавагу нарадзіцца, чым застацца назаўжды ў матчыным чэраве. Зрэшты, здараюцца і выключэнні.

### ***Паталагаанатамы замест акушэраў***

*Па паведамленнях прэсы, паталагаанатамічны музей пры Г-м медыцынскім інстытуце папоўніўся яшчэ адным экспанатам. Жанчына з беларускае глыбінкі зацяжарала, але праз некалькі тыдняў сімптомы цяжарнасці зніклі самі па сабе. Калі праз дваццаць два гады яе прааперыравалі па падазрэнні на ракавую*

*пухліну маткі, хірургі выцягнулі на свет скамянелы плод — літапедыён, які ўвесь гэты час жанчына пранасіла ў сваім чэраве.*

Нейкая баязлівая душа не адважылася выкарыстаць свой шанц — падумала Вікторыя, прачытаўшы тую газетную “сенсацыю” і ўнутрана здрыгануўшыся, — і вось яшчэ адзін са спосабаў аддаць перавагу небыццю: застацца назаўжды ў маміным жывоціку, стварыць сабе ў ім магілу. Але хіба не тое ж самае — жыць на свеце, адчуваючы, што нябожчыца-маці гвалтам завалодала тваімі целам і душой, што яе пагарда дыктуе твае ўчынкі, яе праклёны — перадвызначаюць твой лёс? Па сутнасці, Вікторыя, не здолеўшы абарваць пупавіну крэўнай залежнасці ад маці, дагэтуль яшчэ не нарадзілася насамрэч. Яна скамянела ў сваім страху, як той пачварны літапедыён.

Зрэшты, матчына лона — далёка не заўсёды рай. Дурная маці можа труціць плод алкаголем ды тытунем (і тады матка ператвараецца ў партатыўную газавую камеру), знявечыць ягоныя мяккія косткі гарсэтамі, і нават, нібыта спрактыкаваны кат, праткнуць цемечка непажаданаму дзіцяці распаленай вязальнай спіцай — увогуле, спосабаў забойства бяспраўнага вязня жаночай маткі напрыдумана шмат. І тады, тады… адвечны рай матчынага лона ператвараецца ў франклаўскі канцлагер, дзе няшчаснай ахвяры не застаецца анічога, акрамя як прыняць “каштоўнасці адносін” і скарыцца.

Вязень дзяцінства, Вікторыя рызыкуе так і не знайсці сваё сапраўднае “я”. Як, зрэшты, і народ, да якога яна належыць. Гэты народ таксама **баіцца нарадзіцца**, бо свет навокал змяніўся, стаў іншы, і кожны мусіць цяпер прыняць адказнасць за сваё жыццё на сябе. Але быць ахвярай, “дурным мужыком”, спавядаць

"каштоўнасці адносін" нашмат лягчэй, чым стаць вольным і прызнаць: усё — і ва ўласным дабрабыце, і ў дабрабыце краіны — залежыць ад нас саміх. І мы ўпарта трымаемся за лона матухны-гісторыі, якая ўвогуле нас і не любіла ніколі (мо зацяжарала намі "па залёту"?), — што ж, такі нам, у адрозненне ад іншых, шчаслівейшых народаў, выпаў лёс. Але свой крыж мы можам ператварыць у перамогу, і ў глыбіні ўласнага Ценю адшукаць кропку Сонца, і распаліць Святло "на ўвесь свет вялік", — зразумела, калі адважымся, нарэшце, **нарадзіцца.**

Між іншым, проста фізічнае аддзяленне ад маці не вырашае праблемы: тут патрэбна непаслушэнства замест пакорлівасці, слыннае выкраданне плода з Дрэва Пазнання Дабра і Зла. Не цярплівасць Сізіфа, а мужнасць Праметэя. Гэты цяжкі шлях вымагае шмат высілкаў; нават Адам, які атрымаў свабоду хутчэй па непаразуменні, горка сумаваў па страчанай залежнасці. Але яму, прынамсі, было аб чым шкадаваць. А мы сумуем па страчаным канцлагеры, дзе ўсё вырашалі за нас, дзе не трэба было думаць самастойна, адно жывіцца таннымі харчамі праз плацэнту "лепшай у свеце" эканомікі. Мы, здаецца, ужо выкінуты з лона парадзіхі пры дапамозе кесарава сячэння (трохі гвалтоўна, але дзякуй і за такі шанц), аднак усё працягваем глядзець назад, і туга наша робіцца *цяжарнай смерцю.* "Калі чалавек хоча жыць, ён павінен змагацца і ахвяраваць сваёй звернутай назад тугой, каб дасягнуць найвышэйшай даступнай яму вяршыні", — лічыў Юнг. Калі ж не... Чалавек (альбо народ) становіцца **зачараваным смерцю**. Менавіта гэты душэўны стан Вікторыя беспамылкова вызначала на тварах землякоў, і ў сабе, стомленая марнымі высілкамі перамагчы страх, часам знаходзіла тую ж зачараванасць смерцю, яе спакоем і свабодай.

Але... ці не ілюзія тая свабода? Смерць — *дзверы, якія заўсёды адкрытыя...* Вось толькі — куды? У зіхаценне касмічных зорак, у царства Духу, які вее, дзе захоча? Альбо — назад, у ракавай пухлінай пашкоджаную матку?

Так, народ, які баіцца будучага, не нараджаецца. Ён ператвараецца ў літапедыён — мёртвы, скамянелы плод. Такі народ-агорафоб забывае, што ён — нашчадак славутага старажытнага роду; ягоны шлях — таптанне на месцы, вычэрчванне цыркулем канцэнтрычных-канцэнтрацыйных кругоў, прадрапванне ржавай голкай заезжанага дыска.

Невыпадкова ў тых жа міфах матчына лона — гэта адначасова і сімвал магілы, а пажыццёвая духоўная залежнасць ад маці — метафара смерці.

Так, смерці.

Учора, ранкам свайго правалу, Вікторыя вынырнула са сну, вынесеная нарастаючай хваляй трывогі, якая неўзабаве перайшла ў паніку. Панічны страх, страшнейшы за смерць, насылаецца лясным богам Панам, так, прынамсі, лічылі старажытныя грэкі; чалавек, які падпаў пад уладу гэтага страху, бяжыць і бяжыць, уцякаючы невядома ад чаго, пакуль у рэшце рэшт не ўпадзе мёртвы. Сучаснаму чалавеку бегчы няма куды, ён заціснуты ў вузкі пенал гарадской кватэры, і таму накручвае кіламетры ўнутры сябе. Сэрца Вікторыі шалёна калацілася, мышцы былі напружаныя, бы ў марафонца. Толькі вось куды бегчы? І ці далёка ўцячэш ад самой сябе? Апранулася, хацела выпіць кавы — і не змагла: пальцы дрыжэлі, кава расплюхалася на стол.

Вікторыя стаяла ўжо ў вітальні, калі яе раптам працяла вострае, як удар электратоку, адчуванне-упэўненасць: *я не магу пакінуць кватэру, мне страшна.*

Некалькі разоў яна падыходзіла да дзвярэй і адступалася. Нарэшце, стомлена апусцілася на зэдлік у вітальні.

*Што рабіць, Божа, што рабіць?*

Праз чвэрць гадзіны мусіў пачацца фэст, а яна сядзела, спалоханая мышка-нарушка, і як ні выклікала з найдалейшых закануркаў сваёй істоты Упэўненую Пані, тая не азывалася на яе воклічы, нібы памерла. Страх — яна цяпер толькі зразумела — наступаў прадумана, можна сказаць, па плану, у яго злосных нападах праглядалася свядомая воля: спачатку выцесніў яе з натоўпу дэманстрантаў, потым — з душных аўдыторый, электрычак і аўтобусаў. Апошнім часам яна пазбягала наведваць вялікія крамы, дзе было далёка да выхаду, і купляла ўсё ў ларках ды камерцыйных палатках, а ў залах пасяджэнняў заўсёды садзілася з краю, недалёка ад дзвярэй. Якую памылку яна зрабіла, пазбягаючы "небяспечных" сітуацый! Бо варта было ёй адступіць, аддаючы ворагу новы кавалачак сваёй тэрыторыі, як казлангі бажок рабіўся нахабным, патрабаваў ад яе новых і новых уступак. Страх гнаў яе, бы зграя паляўнічых сабак — параненую жывёліну, ён несся па следу яе крыві, пакуль не загнаў ва ўласную нару. Сёння яе жыццёвая прастора звузілася да памераў кватэры, заўтра яна, нібыта шчыгрынавая скура, сціснецца да памераў ложка, дзе Вікторыя будзе дрыжэць пад коўдрай ад страху, а потым, потым — да магілы, месца апошняга супакаення.

Пэўна, яна памылілася, калі вырашыла змагацца з фабіяй ў адзіночку. Можа, цяпер яшчэ не позна? Яна патэлефануе БМС, так, зараз жа патэлефануе... І — кінула слухаўку, бо ўявіла

вышэшы за чалавечы рост плот райпсіхдыспансера, бляклыя цені ў зашморганых байкавых халатах і шлёпанцах, раўнадушныя да ўсяго навокал, загружаныя “калёсамі”... уявіла Загадчыка, які з гідлівым спачуваннем працягвае ёй сетку апельсінаў... Не, толькі не гэта! *А тады — што?* — спытаў спакойны і разважлівы, быццам чужы, голас унутры яе. І сам сабе адказаў: *дзверы, якія заўсёды адкрытыя.*

У студэнцкія гады, у кінатэатрах, Вікторыя заўсёды садзілася побач з дзвярамі, над якімі гарэлі чырвоныя літары надпісу: “ВЫХАД”. І на кінасеансе жыцця ўсядзець магла толькі **з краю**, таму і трымала ў лядоўні сярод упаковак з лекамі адну, чырвона-жоўтую, па сканчэнні тэрміну годнасці замяняючы яе на новую (БМС, дурненькі, верыў што ў яе бяссонніца і выпісваў чарговы рэцэпт).

Што ж, яна выйдзе праз адкрытыя дзверы, бо *смерць настолькі не страшная, што дзякуючы ёй нішто для нас не страшна.* Гэтай афірмацыі больш за тры тысячы год, і аўтар яе не дурнейшы за Фрэйда — Луцый Аней Сенека.

Вікторыя адкрыла лядоўню, узяла ўпакоўку транквілізатараў. Вось і яна, як той раб, што прасіў у Калігулы смерці... А колькі гадоў змагалася, не жадаючы прыняць “каштоўнасці адносін”! Колькі сіл паклала! Марная барацьба... Што ж, усяго толькі яшчэ адзін суіцыд у зводцы мясцовай статыстыкі... Яна паклала таблеткі ў сумку. І — так стала раптам лёгка на душы, нібыта вось тут, у сумцы, пашпарт са свежанькай — яшчэ чарнілы не прасохлі — візай ва ўсе краіны свету, ды яшчэ — білет на трансатлантычны рэйс: шчаслівa заставацца, панове, выбачайце, калі што не так! І нават вораг быццам бы сцішыўся, разгубіўшыся перад яе новай свабодай, так што Вікторыя, не даючы сабе часу

жахнуцца прычыне раптоўнай палёгкі, падхапіла сумку, начапіла акуляры з зацемненымі шкельцамі (каб *схавацца,* няйнакш, — нібыта ў дзяцінстве, заплюшчыўшы вочы: “А цяпер — шукайце мяне!”) і выйшла з кватэры.

Неба было пахмурным, сэрца адразу ёкнула: навес над сцэнай… Усміхнулася: паміраць сабралася — а пра што дбаю… Да пачатку канцэрта засталіся лічаныя хвіліны, і яна, каб скараціць шлях, пайшла па драўляна-пясчанай вулачцы Калгаснай, па якой у апошні раз хадзіла гадоў дваццаць таму школьніцай з цесна напакаванай фізкультурнай торбай ды пузатым партфелем. Вулачка, як і тады, патанала ў непралазным брудзе, і нават вялізная балотападобная лужышча з падгнілымі, бы краі запушчанай раны, абсягамі была, як ні дзіўна, усё тая ж. У гэтую лужышчу яна калісьці ўвалілася, паслізнуўшыся на чарговым сметніку, што рэгулярна ўтваралі тут мясцовыя жыхары, і доўга потым мыла і сушыла адзенне, каб маці нічога не заўважыла…

Раптам яна спынілася, уражаная ўспасмінам: усё гэта ўжо было, было. Яна ішла па гэтай самай сцяжынцы, ішла, зачараваная смерцю…

Самым пакутлівым было тое, што дзяўчынка любіла маці — а той, хто любіць, безабаронны і адкрыты для нападу. “Ненавіджу яе”, — прызнавалася сястры малодшая, Вольга, якая на матчына “дура!” імгненна адклікалася: “сама такая!” І — дзіўна, маці адступалася, атрымаўшы адпор, увесь свой гнеў скіроўвала на маўклівую старшую дачку, якой назваць маму “дурай” уяўлялася святатацтвам, ад якога неба павінна абрынуцца на зямлю. Менавіта пакуты безадказнай любові прывялі дзяўчынку да думкі пра самагубства — гэта было апошнім адчайна-маўклівым

крыкам, маленнем аб лістасці, пасля якога маці проста не зможа застацца такой, як раней. Вікторыя думала, што ўжо ведае смерць па стане непрытомнасці (гэта было зусім не балюча і не страшна) і што так жа, як з непрытомнасці, яна здолее адтуль вярнуцца ў належны момант, каб мама, рыдаючы ад раскаяння, прыняла яе ў любячыя абдымкі.

У тую раніцу, каб не выклікаць падазрэнняў, яна, як звычайна, выправілася ў школу з партфелем, у якім, аднак, замест падручнікаў і сшыткаў ляжаў пакунак, набыты ёю напярэдадні ў гаспадарчым аддзеле універмага. Яна доўга блукала сярод неахайных слоікаў з ядавіта-блакітным медным купарвасам і нейкім, падобным на брудную соль, парашком, пакуль нарэшце не спыніла свой выбар на невялічкім пакунку — ён якраз умяшчаўся ў партфель — з надпісам “Фунгіцыд”. У пакунку быў блякла-зялёны парашок — менавіта так Вікторыя ўяўляла сабе той чароўны раслінны састаў, якім Урфін Джус з яе любімай казкі ажыўляў драўляных салдатаў. Ці дапаможа гэты парашок ажывіць душу яе мамачкі? Касірша раўнадушна ўзяла ў яе медзякі, зэканомленыя ад школьных абедаў, нават не пацікавіўшыся, што за агарод збіраецца апырскваць піянерка ў сярэдзіне зімы. Дома Вікторыя ўважліва вывучыла інструкцыю — *асцярожна: яд! пры трапленні на слізістыя неадкладна прамыць!* — і схавала пакунак у партфель.

Каля гадзіны яна правяла ў паўцёмным падвале пад’езда, дзе ў вялізных, пакрытых павуціннем трубах журчэла вада, і ледзь не заснула. Потым ёй захацелася салодкага. Дзяўчынка пералічыла дробязь, якая ў яе засталася, — роўна семнаццаць капеек — і, схаваўшы партфель за трубамі, збегала ў суседнюю кулінарыю. Пірожнае здалося ёй незвычайна смачным. Было шкада пакідаць

цёплы, ціхі падвал, але трэба было ажыццяўляць задуманае: усё роўна яна не пайшла сёння ў школу, класная кіраўніца на перапынку абавязкова патэлефануе маці, і калі высветліцца, што яна прагуляла *без прычыны…*

Пустая кватэра сустрэла яе адчужана і ніякавата. Бы зладзейка, яна асцярожна пракралася на кухню, нажніцамі адрэзала вугалок пакунка і наўздагад сыпанула порцыю парашку ў дзіцячы металічны кубачак, дадаўшы з чайніка вады: маці прывучыла яе піць толькі кіпячоную.

…святло, асляпляючае святло залівае яе, б'е ў вочы, ёй балюча глядзець на гэтыя яркія лямпы, выключце іх, калі ласка! Яе вязуць па ярка асветленаму калідору, да сцен прыціскаюцца цені, замест твараў у іх белыя маскі, яе галава моцна прыціснута да чагосьці цвёрдага, нечые рукі ў гумавых пальчатках уводзяць ёй у горла доўгую трубку, трубка раздзірае нёба, яна хоча закрычаць, але не можа, яна давіцца, захлёбваецца вадой, якую ўліваюць у трубку, а потым трубку выцягваюць, і яна зноў не паспявае крыкнуць, каб яе адпусцілі, не мучылі больш, дазволілі пайсці ў цёплы, ціхі падвал, там яна і будзе жыць, і ніхто больш не назаве яе курвай, але ёй не даюць сказаць ані слова, і жахлівая трубка прадзіраецца праз яе зліплыя вантробы зноў і зноў, а выратавальная непрытомнасць усё не наступае…

…чаму яна ляжыць адна ў гэтым халодным пакоі, на цыратовай кушэтцы, нават без прасціны, чаму яе не паклалі, прынамсі, у звычайную палату, гэта ж — бальніца, дзіцячая бальніца, ці не так? “Таму што ты нікчэмнасць, дрэнь, — гаворыць маці і гідліва хіхікае, — я хацела б, каб маёй дачкой

была тая дзяўчынка, пра якую пісалі ў газетах: яна папрасіла забраць у яе вочы, здаровыя вочы, і аддаць сляпому сакратару кампартыі ЗША, каб паскорыць рэвалюцыю ў Амерыцы. Я б ганарылася такой дачкой! А такіх, як ты, мы будзем спальваць у паравозных топках!" Медсястра схіляецца да яе, уводзіць нешта ў трубку кропельніцы, і твар маці туманіцца, знікае...

Маці прыйшла да яе ў лякарню толькі аднойчы і затрымалася роўна на хвіліну. Яна нават не падышла да ложка і, стоячы ў дзвярах, кінула: "Што цяпер будуць гаварыць людзі!"

Праз тры тыдні Вікторыя вярнулася ў школу. Настаўнікі старанна рабілі выгляд, што нічога не здарылася, размаўлялі з ёю павялічана-клапатліва, як і аднакласнікі, відавочна, кімсьці праінструктаваныя, але яна не давярала ні адным, ні другім. Ах, яе аднакласнікі! Хто-то, а яны дык мелі ў запасе цэлы набор роляў, пляваць яны хацелі на "спіраль грамадскага развіцця", бо цікавіліся іншымі спіралямі — процізачаткавымі, і барвова-сіняватыя плямкі на дзявочых шыйках, сарамліва замаскіраваныя завітымі пасмачкамі, маглі б расказаць пра іх другое, патаемнае жыццё, — зрэшты, настаўнікі лічылі за лепшае не заўважаць таго, што адбывалася не на іх тэрыторыі, у іх таксама былі свае ролі. На выпускным вечары Людка Г., самая разбітная з класа, чытала верш на рускай мове "Не смейте забывать учителей" — яны, настаўнікі, нават усплакнулі, калі на апошнім радку Людчын голас задрыжэў, бы ад паўнаты пачуццяў, і яна выбегла з залы; Вікторыя кінулася следам — і заспела яе ў прыбіральні: Людка, з цыгаркай у руцэ, заходзілася ад рогату: "Класна я гэтых дур, вучылак, умыла?" Можа, так і трэба жыць —

маючы па два, тры аблічча? Вось жа і мама з таварышамі па партыі размаўляе адным голасам, а з ёю — зусім іншым! Здаецца, усім навокал гэта дадзена ад нараджэння — хлусня як другая скура, як шкарлупінне, што абараняе курыны эмбрыён, і толькі яна адна нарадзілася чамусьці не такой, як усе, з аголенымі нервамі і слабымі сасудамі...

— І тады ты зламалася. Ты выракласа сябе, і заглыбока схавала свой боль.

Ты вырашыла стаць такой, як усе, каго ставіла табе ў прыклад мама: упэўненай ў сабе, цынічна-дзелавітай, падманам па фальшывай кантрамарцы прабрацца на сцэну, дзе на ўсю моц ішла захопліваючая дух гульня, і толькі для цябе адной у ёй не прагледалася ролі. Ты ўзяла сабе чужую ролю, з руплівасцю першай вучаніцы капіравала чужыя манеры і словы, не разумеючы яшчэ, што цябе падпільноўвае самае страшнае, што можа здарыцца з чалавекам: небяспека пражыць **не сваё** жыццё. Ты выпесціла ў сабе новае "я" — Актыўную Камсамолку, потым — Упэўненую Пані, якая дзякуючы сваёй звычцы дасканала выконваць чужыя загады неўзабаве аказалася прынятай у свет масак — местачковую наменклатуру (як узрадавалася мама!). Так, толькі гэтае "дасягненне" і ўмацоўвала ў табе пачуццё ўласнай годнасці, у якую ты ніколі, ніколі не верыла, бо памятала, хто ты ёсць *на самай справе:* "нікчэмнасць, дрэнь". Ты глядзелася ў чужыя вочы — мужа, калег, начальнікаў — як у люстэрка, з хваляваннем лавіла ў іх адбітак уласнай каштоўнасці, якая ніколі не была для цябе самадастатковай. І вось тут дык ты і трапілася ў пастку, бо на правінцыяльнай сцэне, дзе давялося табе разыгрываць спектакль свайго жыцця, з года ў год ішла адна-

адзіная пастаноўка: ідыёцкае маскі-шоу, дзе нельга ні на ёту адступіць ад сцэнара і замест прымітыўнага тэкста бяздарнага аўтара вымавіць нешта *сваё.* Гэты спектакль, ну трэба ж, аказаўся пастаўлены ў духу брутальнай інтанацыі твайго дзяцінства: вышэйшы па пасадзе тут паводзіць сабе як дробны мафіёзі, асабістая годнасць вытоптваецца, кожны імкнецца зваліць сваю віну на іншага. У гэтай гульні ты атрымала ролю — міс Рашучасць, а як жа ж! — і табе пастаянна даводзілася сябе кантраляваць, каб незнарок акрайчык тае маскі не адклеіўся, як вус у Папаніна ў адной старой камедыі, але тут была для цябе не камедыя, а драма жыцця і смерці, без дурніцаў, таму што вох як цяжка было прымусіць скамянець у ціснах зададзенага вобразу свой сапраўдны твар — твар дзяўчынкі, зацкаванай, нялюбай, вечна вінаватай, прыціснутай цяжарам матчыных праклёнаў. Той дзяўчынцы не было месца ў клане "паважаных людзей" — тут ты не памылілася! — і таму ніхто: ні муж, ні калегі, ні начальнікі — не павінны былі ўбачыць яе, ад каго адцуралася нават родная маці.

Так, ты трапілася ва ўласную пастку: пастаянна сябе кантраляваць стала

тваёй звычкай. Але вегета-сасудзістыя рэакцыі — адзінае, што нельга сфальсіфікаваць. Тваё цела здрадзіла табе. Яно не жадала жыць па выдуманых табой правілах, пад бездакорна-лжывым грымам удзельнічаць у ідыёцкім маскі-шоу, яно, тваё сумленнае цела, баранілася па-за тваёй воляй, яму рабілася млосна на шматгадзінных зборышчах у перапоўненых залах, куды не прасачыцца ні свежаму паветру, ні свежай думцы — цела тваё гатова было ўсім выдаць тваю хлусню! Вось тады і з'явіўся страх: *толькі б не ўпасці, толькі б не...*

А страх — гэта крах. Крах кар'еры Упэўненай Пані. Крах сям'ї і кахання. Падсвядомасць — нарэшце ты ўцяміла! — усё успрымае **лі-та-раль-на,** пераносны сэнс пераводзіць у прамы. Ты баялася ўпасці ў вачах БМС, у вачах "паважаных людзей" — страціць "прэстыж", аскандаліцца ("усё павінна быць прыстойна!") — нездарма дэман страху мучыў цябе менавіта сярод тых, хто ведаў тваё "не-я" — фальшывую маску. Падсвядомасць перавяла твой страх на сваю мову, прымітыўна-цялесна-дзіцячую: ты баялася ўпасці ў прамым сэнсе слова. А што яму яшчэ заставалася рабіць, таму навязліваму суфлёру пад сцэнаю? Ён паслухмяна выконваў мамін загад: быць дасканалай! Выконваў аўтаматычна, слепа і глуха, нягледзячы на тое, што прага дасканаласці ёсць, па сутнасці, сцэнар самазнішчэння. І ты, паслухмяная маміна дачка, забівала сябе: ты змагалася са сваім целам, якое, дарэчы, паводзіла сябе абсалютна **нармальна** — проста рэагавала на адсутнасць кіслароду ў паветры, і ўсё! — а ты змагалася з уласным сэрцам і сасудамі — вось гэтая маніякальная заклапочанасць і была ў табе ненармальнай. З целам не трэба змагацца, бо яно — мудрае, яно старажытнейшае за свядомасць і само ведае, калі, у які момант яму лепш вызваліцца ад свайго назойлівага ментальнага двайніка, звесці сваю жыццядзейнасць да мінімуму. І зноў жа, цела *само ведае* (ад Бога, бо вырашаць тое — толькі Боскае права, не нашае), калі яму наогул пакінуць гэты свет.

Але цябе вучылі **перамагаць,** і ў той жа час унушалі, што ты — нікчэмнасць, ні на што не здатная. Тая ж трагедыя адбылася і з народам, да якога ты належыш. У выніку паспяхова выхавалі самагубцаў. (Ці не тое ж робіць сучасная рэклама, патрабуючы ад чалавека "быць дасканалым", што б там ні было?) Аднаму нас не вучылі і не вучаць: быць самімі сабой. Убогая і няшчасная твая

крывадушнасць у вартай жалю спробе выглядаць параможцай чаго б гэта ні каштавала — нават за кошт жыцця, як высвятляецца, — твая труслівая ўсмешка і “бесклапотная” балбатня на іх сходках, калі ўнутры ўсё скалыналася ад трывогі, — вось гэта і было *падзеннем*! А што да твайго страху, дык гэта — страх **выкрыцця** тваёй хлусні. Гэта сігнал глыбіннай нязгоды гуляць у бяздарнай п’есе. Крык адчаю дзяўчынкі, якую ты ў сябе затуркала, загнала ў вугал за крэслам і падаконнем — акурат як тое рабіла мама! — і таксама, як і мама, ты яе ў сабе не любіш, не любіла. Яна, тая няшчасная дзяўчынка, настойліва даводзіла, што ты жывеш не сваё жыццё, але мы не чуем голасу праўды, не можам дачуцца, пакуль не загонім саміх сябе ў тупік, дзе застаецца толькі выпіць упакоўку транквілізатараў альбо накінуць зашмаргу на шыю.

Між іншым, тыя “ключыкі”, якія ты ўвесь час падбірала, не спрацоўвалі менавіта таму, што немагчыма вызваліць сваё сапраўднае “я” з унутранага канцлагера, над якім пануе Упэўненая Пані. Але яна, дзякуй Богу, нарэшце **правалілася**. Мамін праклён збыўся, і страх... знік. Учарашні дождж змыў у сцёкавую канаву тваё фальшывае жыццё. Нібыта хвалі ўсясветнага патопу альбо каляплодныя воды, сышоў і пакінуў цябе **нованароджанай** для жыцця без страху.

Без страху!

Абдымі ж тую дзяўчынку, якая жыве ў табе, палюбі яе, бо ніхто, акрамя цябе, не можа гэта зрабіць.

І яшчэ... даруй маме. Яна таксама — ахвяра, бо пражыла не сваё жыццё.

Некранутая чырвона-жоўтая ўпакоўка плюхаецца на дно пакунка для смецця; туды ж ляцяць граматы з подпісам Загадчыка, лісткі настольнага календара з датамі пасяджэнняў і нарад... Свабодная! Яна нарэшце — свабодная! Вікторыя паднімаецца, каб адчыніць акно — ёй чамусьці не хапае паветра — і ледзь паспявае плюхнуцца назад у крэсла, каб не ўпасці, бо ў вачах становіцца зноў цёмна ад лютага болю. У псіхааналітычнай сваёй Адысеі яна зусім забыла пра лекі, якія трэба было неадкладна прыняць яшчэ, пэўна, гадзіну таму, — урачы ж папярэджвалі! Павольна, сабраўшы ўсе сілы і пакрываючыся ад слабасці ліпкім потам, Вікторыя дабіраецца да дзвярэй і расчыняе іх насцеж. Калідор палаца культуры, звычайна ажыўлены, сёння пусты; з вялікай залы наплываюць густыя хвалі гукаў — відавочна, там ідзе нейкае “мерапрыемства”. Яна вырашае рухацца туды і амаль ужо дасягае, спыняючыся на кожным кроку, дзвярэй у пакойчык за сцэнай, калі ўспамінае пра тэлефон. Прасцей было пазваніць проста з кабінета — вахцёрцы, напрыклад, тая б збегала ў аптэку. Вікторыя аглядваецца: зваротны шлях здаецца даўжэзным — а ўсяго якіх-небудзь метраў дзесяць! — ды і дзверы ў грымёрку побач, у двух кроках, і яна цягнецца да іх, і раптам перастае адчуваць левую руку, — рука нямее ад пляча да кончыкаў пальцаў, як у паркавай статуі, здаецца, зараз пойдзе трэшчынкамі і асыплецца на падлогу, але правая — правая рука ўжо схапілася за дзвярную ручку, і Вікторыя ўцягвае непаслухмянае цела ў пакой. Там, як на бяду, нікога няма, толькі за кулісамі цепліцца нейкае жыццё, і тады яна робіць яшчэ некалькі крокаў і аказваецца на вялікай сцэне за кулісай.

Схаваная занавесам, Вікторыя глядзіць ў залу. Боль у галаве быццам бы сціхае, і нават зрок яснее, так што яна можа разглядзець твары ў першым радзе. Вось уціскаецца ў крэсла Загадчык, бачна, як ён нервуецца, як лісліва шэпча нешта на вуха Куратару — ці не пра яе звальненне? І перад гэтымі людзьмі яна баялася “упасці”? Іх ухваленні цаніла вышэй за ўласнае пачуццё годнасці? Вікторыі так смешна, што яна фыркае, бы дзяўчынка. Ды яны самі — ахвяры страху, кожны з іх трасецца за сваю пасаду, хоча выглядаць пераможцам, а як жа, усе яны баяцца *падзення*, выкрыцця сваіх патаемных слабасцей ды заган. Яна баялася тых, хто сам баіцца!

*Я смяюся з цябе, дурны, бязглузды страх! Я буду апранацца ў яркія файныя строі. З усмешкай я буду ісці наперад, насустрач лёсу. Я пачну ўсё з пачатку, бо я толькі сёння нарадзілася...*

Вікторыя заплюшчвае вочы, заспакоена пасміхаецца скрозь слёзы (што гэта — няўжо салёныя камянюкі пад павекамі расталі?), і, здаецца, боль зусім праходзіць, і нават рука робіцца зноў гарачая і жывая. На сцэне дзяўчынка (ці не тая самая, якую яна бачыла ў скверыку з сяброўкамі? так, яна!) усё з той жа ненатуральнай усмешкай, з якой некалькі гадзін таму працягвала руку па цыгарку, чытае нейкія бяздарныя вершы, завучаным жэстам прыціскаючы да грудзей пухлявыя ручкі. Вікторыі шкада яе: які шлях давядзецца прайсці той, каб зразумець: рукі да сэрца можна прыціскаць толькі тады, калі яно сапраўды баліць!

Яна хоча штосьці вельмі важнае сказаць дзяўчынцы, якая ўжо скончыла сваё чытанне, але тут у галаве нібыта лопаецца вогненны шар, чырвона-аранжавыя кругі плывуць перад вачыма, і Вікторыя паспявае яшчэ падумаць: *вось будзе гжэчна грымнуцца*

*ў непрытомнасці перад усёй гэтай выглянцаванай публікай!* — а потым дашчаны насціл сцэны перастае быць апорай…

*Чым ад людзей далей, тым спуск круцейшы.*
*Як вышчараны лесвіцы прыступкі!*
*Мой Цень — ён там, хаваецца унізе,*
*Я асвятляю да яго дарогу.*
*Падземны вецер мкнецца патушыць*
*Малы агеньчык, што нясу ў далонях.*
*Смяротнаму стварэнню не пазбегнуць*
*Адвечнай бойкі з несмяротным злом.*
*Іду адна —*
*Ужо шмат тысячагоддзяў.*
*Але мой Цень — старэйшы за мяне.*
*Я ведаю: ён — там, на самым дне...*
*На жаль, кароткае жыццё ў свечкі:*
*То гасне, то перамагае цемру*
*Ды неабдымны сон пачвар трывожыць.*
*І толькі час адкрые таямніцу:*
*Імя другое Ценю ёсць Святло.*